ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 ЛЮТАГА 2016 г. ЧАЦВЕР № 31 (28141) Кошт 2100 рублёў
Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А



**На што хварэюць студэнты?**



**Гэта рэальна працуе!**



**Глазура для «бісквіту»**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$445 млн**

*у эквіваленце плануецца засвоіць па кантрактах з расійскім бокам на будаўніцтве Беларускай АЭС у 2016 годзе. Будзе працягнута работа па ўзвядзенні асноўных будынкаў і збудаванняў абодвух энергаблокаў. Плануецца прыступіць да рэалізацыі асноўных значных аперацый па ўзвядзенні першага энергаблока: мантаж корпуса рэактара, парагенератараў, турбаагрэгата, электратэхнічнага абсталявання. Сярод іншага, плануецца ўвядзенне ў эксплуатацыю 12 жылых дамоў у Астраўцы агульнай плошчай 49,5 тыс. кв.м для будаўнічага персаналу і спецыялістаў Беларускай АЭС.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.02.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 21914,00 ▲ |
| Еўра | 24438,00 ▲ |
| Рас. руб. | 281,10 ▼ |
| Укр. грыўня | 820,75 ▲ |

# КНІГА ЕДЗЕ Ў ГОСЦІ



**Дадзены старт дабрачыннай акцыі «Падарожжа Кнігі да дзяцей». Падчас акцыі перасоўная бібліятэка для дзяцей-сірот з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу будзе працаваць у Мінскай і Магілёўскай абласцях. Усяго ў акцыі змогуць прыняць удзел больш за 90 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, у якіх выхоўваюцца каля 700 сірот.**

**На здымку: выхаванцы сталічнага дзіцячага дома сямейнага тыпу Таццяна ТУЛУПАВА, Вікторыя КАРНАФЕЛЬ і маці-выхавальніца Раіса ШАМАК.**

Фота БЕЛТА.

# АДУКАЦЫЯ: ЯКАСЦЬ І ДАСТУПНАСЦЬ

Кожны бюджэтны рубель, які ўкладваецца сёння ў сацыяльную сферу, павінен максімальна эфектыўна выкарыстоўвацца

**Такую думку агучыла на калегіі Міністэрства адукацыі намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.**

— Нас цікавіць эфектыўнасць працы ўстаноў абсалютна ўсіх узроўняў: ад дашкольнай да спецыяльнай адукацыі, вышэйшай школы і адукацыі дарослых, — падкрэсліла Наталля Качанава. — У 2015 годзе ўрад вельмі шмат увагі надаваў дзейнасці сістэмы адукацыі, мы праводзілі нарады, выязджалі ў рэгіёны, сустракаліся з настаўнікамі, выхавальнікамі, кіраўнікамі ўстаноў адукацыі для таго, каб прыняць правільныя рашэнні. Галоўная задача, якая стаіць сёння перад галіной, — гэта якасная і даступная адукацыя. Але разам з тым нельга забывацца пра яшчэ адзін важны аспект — я маю на ўвазе здароўе нашых дзяцей.

Наталля Качанава паведаміла, што летась Камітэтам дзяржкантролю праводзілася праверка, якая ўстанавіла шматлікія факты парушэння арганізацыі харчавання ў дзіцячых дашкольных установах, прычым парушэнні былі выяўлены ў кожнай з 58 правераных устаноў.

— Нягледзячы на тое, што за харчаванне дзяцей у школах адказваюць камбінаты школьнага харчавання, я лічу, што кожны кіраўнік установы адукацыі павінен цікавіцца, як і чым харчуюцца яго вучні, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Хачу звярнуць іх увагу яшчэ на адну акалічнасць. У пачатковай школе прадмет «Фізічная культура» павінны весці настаўнікі фізічнай культуры ( такіх спецыялістаў у нас хапае — іх рыхтуюць 12 ВНУ!). І перш чым патрабаваць ад дзіцяці выканання на ўроках нейкіх нарматываў, трэба яго спачатку адпаведна падрыхтаваць, а зрабіць гэта можа толькі прафесіянал. У гэтых пытаннях нельга дапускаць абыякавасці. Сёння ў краіне распрацоўваюцца новыя вучэбныя праграмы і планы. Але мы абавязкова павінны прыводзіць іх у адпаведнасць са здароўем нашых дзяцей, і нагрузка на школьнікаў павінна быць адэкватнай.

СТАР. 3

■ Спажывец

# Тры мільёны на сукенку, або Што хаваецца пад цэннікамі

**Карэспандэнты «Звязды» праверылі, ці залежыць якасць адзення ад цаны**

**«За якасную рэч не шкада і пераплаціць», — бадай, самы распаўсюджаны аргумент пакупніка. У выпадку з адзеннем падыход лагічны: купіў адну добрую спадніцу і насі колькі заўгодна. Але ці заўсёды высокі кошт вопраткі апраўдвае якасцю? Разам з дызайнерам Юліяй ГІЛЕВІЧ мы прайшліся па краме і паглядзелі, што хаваецца пад цэннікамі.**

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

# АГУЛЬНАЯ ГАТОЎНАСЦЬ

## Толькі ўсенародны характар абароны можа гарантаваць паспяховую ахову дзяржавы

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы перад удзельнікамі збору па тэрытарыяльнай абароне. «Як паказвае шматвяковы вопыт, толькі надаўшы абароне ўсенародны характар, можна гарантаваць паспяховую ахову дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Для гэтага ў Беларусі стварылі і ўжо больш за 10 гадоў развіваюць тэрытарыяльную абарону.**

У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы спыніўся на асноўных напрамках развіцця тэрытарыяльнай абароны, у тым ліку на неабходнасці больш дакладна вызначыць неабходную колькасць тэрытарыяльных войскаў. «Маючы аптымальны склад гэтых войскаў, мы павінны быць упэўненыя, што пры ўзнікненні ваеннай пагрозы абстаноўка ў раёнах будзе пад кантролем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не можам сабе дазволіць прызваць пагалоўна працаздольнае мужчынскае насельніцтва ў тэрытарыяльныя войскі і паставіць іх са зброяй ля кожнага скрыжавання. Гэтага і не трэба».

Прэзідэнт даручыў таксама шукаць новыя формы і спосабы сумеснага прымянення Узброеных Сіл, унутраных войскаў, органаў пагранічнай службы і ўнутраных спраў, воінскіх фарміраванняў тэрытарыяльных войскаў, павышаць іх манеўраныя магчымасці. «Армія павінна быць мабільнай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы робім нашы Узброеныя Сілы больш мабільнымі, каб маглі перакінуць дастатковую колькасць падрыхтаваных людзей у любую кропку Беларусі».

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад мясцовымі ўладамі задачу павысіць эфектыўнасць кіравання тэрытарыяльнай абароны, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. У тым ліку за кошт прафесійнага і стараннага падбору ваенабучанага рэзерву, афіцэрскага складу. Неабходна таксама праводзіць непасрэдную, канкрэтную працу з ваеннаабавязанымі запасу. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паставіў канкрэтныя задачы па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай і нарматыўна-прававой баз тэрытарыяльнай абароны.

Цяперашнія зборы накіраваны на паглыбленне ведаў па пытаннях тэрытарыяльнай абароны ў кіраўнікоў абласнога ўзроўню. Аляксандр Лукашэнка заклікаў генерал-губернатараў падысці да ўдзелу ў зборах не фармальна, паглыбіцца ва ўсе нюансы дзейнасці войскаў тэрытарыяльнай абароны. Кіраўнік дзяржавы даручыў правесці аналагічныя мерапрыемствы са старшынямі райвыканкамаў і гэтак далей. «Узровень падрыхтоўкі кіраўнікоў павінен быць такім, каб яны, калі спатрэбіцца, маглі самастойна арганізаваць надзейную абарону ў сваім раёне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Эфектыўным метадам удасканалення практычных навыкаў войскаў тэрытарыяльнай абароны з'яўляюцца раптоўныя праверкі. Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета Бяспекі пачаць падрыхтоўку да чарговай такой праверкі.

# ЗА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ КУЛЬТУРЫ

За значны асабісты ўклад у папулярызацыю культурнай спадчыны беларускага народа за мяжой і ўмацаванне добрасуседскіх адносін паміж Беларуссю і Польшчай Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь узнагародзіў ордэнам Францыска Скарыны старшыню галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Яна Сычэўскага і сакратара галоўнага праўлення БГКТ Валянціну Ляскевіч.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны мастацкі кіраўнік ансамбля беларускай песні «Прымакі» Юрый Астапчук.

# ФАРМІРАВАЦЬ КУЛЬТУРУ СПАЖЫВАННЯ ІНФАРМАЦЫІ

**Работа рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі ў Год культуры, сацыяльнае партнёрства і асноўныя тэндэнцыі развіцця публічных бібліятэк. На калегіі Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама вызначаны прыярытэты 2016 года.**

Прааналізаваць поспехі і недапрацоўкі, вызначыць перспектыўныя кірункі далейшай работы заклікаюць ўсе тыя, хто вызначае ідэалагічную палітыку і ад каго залежыць эфектыўнасць яе рэалізацыі. Бадай, адна з галоўных задач — узмацненне кадравага патэнцыялу. Сёння амаль у 60% прадстаўнікоў ідэалагічнай вертыкалі Гомельскай вобласці стаж работы на займаемай пасадзе не перавышае пяці гадоў.

— Патрабаванне, агульнае для ўсіх — каб спецыяліст мог прыйсці ў любы калектыў і адказаць на любое пытанне, — падкрэслівае **начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАЎГАЛА.**

Значная ўвага сёлета надаецца ўдасканаленню работы рэгіянальных СМІ. Цяпер на Гомельшчыне зарэгістраваны 24 дзяржаўныя газеты з агульным тыражом у 165 тысяч экзэмпляраў. Іншая справа, што іх эфектыўнасць ацэньваецца не толькі колькасцю надрукаваных тэкстаў. **Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ** падкрэслівае, што сёння неабходна больш актыўна заваёўваць інтэрнэт-прастору:



Фота БЕЛТА

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ і намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ падчас знаёмства з выставай дасягненняў Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама ў розных сферах дзейнасці ў 2015 годзе.

— Мы павінны фарміраваць культуру спажывання інфармацыі. Самім СМІ важна клапаціцца не толькі пра дабрабыт і ўплыў на чытацкую аўдыторыю, але і фарміраваць медыяпісьменнасць. Сёння патрэбна ствараць не толькі сайты, але і спецыяльныя мабільныя дадаткі для тых, хто хацеў бы ў дарозе карыстацца самай свежай інфармацыяй.

Не застануцца па-за ўвагай ідэалагічнай вертыкалі мерапрыемствы, якія будуць праводзіцца ў межах Года культуры. Тут вельмі шырокі спектр работы: ад маніторынгу культуры паводзінаў кіраўнікоў і захавання дысцыпліны да мадэрнізацыі паліграфічных прадпрыемстваў і развіцця рэгіянальнага радыёвяшчання. Плюс інфармацыйнае суправаджэнне такіх сацыяльна значных падзей, як 75-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 30-годдзе чарнобыльскай катастрофы і юбілеі класікаў нацыянальнай літаратуры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Меркаванні

# АД СТРАТЭГІІ САНКЦЫЙ ДА СТРАТЭГІІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Адмена Саветам Еўропы санкцый у дачыненні да нашай краіны дае падставы спадзявацца, што нарэшце ў нас з Захадам будуць выбудоўваца нармальныя стасункі — без прыдзірак і «двайных стандартаў». Пра гэта ў панядзелак пасля прыняцця Саветам Еўропы адпаведнага рашэння заявіў і міністр замежных спраў Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер: «Чакаю, што гэта дазволіць нам развіваць больш шчыльныя стасункі з Беларуссю». Мы пацікавіліся ў нашых парламентарыяў, аналітыкаў, грамадскіх дзеячаў, як яны ацэньваюць гэты крок заходніх суседзяў.**

**Наталля ГУІВІК, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве:**

— Нарэшце ў Савеце Еўропы перамог розум! Нарэшце санкцыі адменены — яны былі незаконнымі і несправядлівымі. Савет Еўропы зразумеў, што наша краіна настроена на дыялог. Думаю, на гэта рашэнне значна паўплывала пазіцыя нашай дзяржавы ў дачыненні да канфлікту на Украіне. Беларусь стала міратворчай пляцоўкай, прыклала шмат намаганняў, каб ваенныя дзеянні спыніліся. Еўропа ўбачыла, што мы нацэлены менавіта на мірныя адносіны.

Акрамя гэтага, Беларусь — суверэнная, самастойная дзяржава, якая прытрымліваецца ўласнай пазіцыі. Наша краіна выбірае «залатую сярэдзінку», і Еўропа разумее, што з намі можна і трэба сябраваць.

**Арсеній СІВІЦКІ, дырэктар Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў:**

— У цэлым дадзены крок быў чакаемы. Разглядалася два варыянты: ці замарозка санкцый на некалькі месяцаў, ці іх адмена. Развіццё падзей па другім сцэнарыі стала магчымым дзякуючы таму, што некалькі еўрапейскіх краін — напрыклад, Аўстрыя, Венгрыя — былі за тое, каб санкцыі нарэшце адмянілі. Гэта ў многім сведчыць пра тое, што Еўрапейскі саюз мяняе сваю стратэгію ў дачыненні да нашай краіны.

Трэба памятаць, што ЕС сёння жыве ва ўмовах двух крызісаў: украінскага і сірыйскага. З-за апошняга, дарэчы, Еўропа пакутуе ад наплыву мігрантаў. На гэтым фоне наша краіна выступае як надзейны партнёр, асабліва з улікам той ролі, якую мы іграем у сваім рэгіёне.

Еўрапейскі саюз адмаўляецца ад неэфектыўнай стратэгіі санкцый і пераходзіць да стратэгіі супрацоўніцтва. Перад нашай краінай адкрываюцца новыя магчымасці: мы можам атрымаць доступ да фінансавых інструментаў ЕС, да грантавай палітыкі Еўрапейскага саюза. З адменай санкцый паляпшаецца інвестыцыйны і бізнес-клімат у нашай краіне — для буйных інвестараў вельмі важна, каб да краіны, на рынак якой яны выходзяць, не прымяняліся ніякія абмежаванні. Можна спадзявацца, што ў красавіку рашэнне аб адмене санкцый у дачыненні да нашай краіны прымуць і Злучаныя Штаты — звычайна ўрад ЗША каардынуе сваю палітыку з Еўрапейскім саюзам.

**Ігар МАРЗАЛЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, загадчык кафедры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова:**

— Справядлівасць урэшце стала рэальнасцю. Я асабіста надзвычай задаволены тым фактам, што зняты рэжым санкцый у дачыненні да Беларусі. Гэта невымоўнае сведчанне таго, што наша краіна на правільным шляху, што мы ўпэўнена развіваемся, можам адстойваць свае інтарэсы. Пры гэтым наш голас пачынаюць чуць у Еўропе.

Гэта вялікае дасягненне нашай знешняй і ўнутранай палітыкі. А таксама тут немалаважнае значэнне мае тое, што Беларусь на працягу гэтага і мінулага года дэманстравала мэтанакіравана міралюбівую знешнюю палітыку. Беларускаму ўраду, Прэзідэнту, Міністэрству замежных спраў атрымалася давесці і даказаць тое, што Беларусь — гэта не праблема для Еўропы. Што мы вырашаем свае праблемы ў цывілізаваным рэчышчы і што з намі трэба мець нармальныя, прыязныя стасункі. Гэта толькі на плюс і Еўрасаюзу, і нашай краіне, і ўсяму кантыненту ў цэлым.

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

— Наша арганізацыя заўжды лічыла, што любыя дзеянні метадам санкцый некканструктыўныя. Падчас дзеяння санкцый Беларусь вырывалася з кантэксту еўрапейскіх адносін. Гэта негатыўна паўздзейнічала на развіццё беларускага малога і сярэдняга бізнесу праз скарачэнне праграм, кантактаў, сувязяў з ЕС. Я не аднойчы выступаў, у тым ліку і ў Брусэлі, з думкай, што ўвядзенне санкцый несправядлівае ў адносінах да нашых прадпрымальнікаў і трэба наадварот пашыраць кантакты, даваць магчымасць кіраўнікам краін часцей сустракацца, успрымаць вопыт адно аднаго, інтэграваць еўрапейскі досвед у нашу краіну. Тое, што зараз гэта недарэчнасць выпраўлена, я ацэньваю цалкам станоўча.

**Дзмітрый ПЯСКОЎ, прэс-сакратар прэзідэнта Расійскай Федэрацыі:**

— Мы вельмі пазітыўна гэта (адмену санкцый. — **ТАСС.**) успрымаем. Гэты крок лішні раз паказвае абсалютную бессэнсоўнасць санкцый, бесперспектыўнасць працягу санкцыйнага дыялогу, наогул недасканаласць санкцыйнага мыслення.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*
**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

## ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ РАЗАМ

### Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць чарговыя прамыя лініі

Рашэнні па праблемах прымаюцца не пазней чым праз 30 дзён. Дарэчы, многія спрэчныя пытанні атрымліваецца вырашаць ужо ў дзень звароту.

**У гэтую суботу, 20 лютага, на званкі ў краіне з 9.00 да 12.00 адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам** — намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам** — старшыня Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам** — намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам** — намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатольевіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васільевіч (80172224444).

■ Добрая навіна

# НЕ АСФАЛЬТ, А БЕТОН

**У Гродне ўпершыню сярод абласных цэнтраў краіны пабудуюць бетонную магістраль.**

Будаўніцтва бетонных дарог прадугледжана рэспубліканскай праграмай развіцця вулічна-магістральнай сеткі. Бетонаўкладчную машыну нямецкай вытворчасці набыло ААТ «Гроднапрамбуд». Спачатку яе апрабавалі на пракладцы шэрагу ўнутрыквартальных праездаў у абласным цэнтры, пад'язных шляхоў да жывёлагадоўчых комплексаў у раёнах вобласці. А цяпер задача — пабудаваць магістральную чатырохпалосную дарогу, якая прадоўжыць вуліцу Пушкіна да вуліцы Курчатава з выхадам на аб'язное кальца вакол горада. **Намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО** зазначыў, што тэрмін эксплуатацыі бетонных дарог значна большы ў параўнанні з асфальтавымі. З цэментам у вобласці праблемы няма, плюс і ў тым, што бетонную дарогу можна будаваць пры нізкай тэмпературы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■

# На тэлевізійнай хвалі

## Малодшых школьнікаў запросяць у квест-гульню

**У новым сезоне тэлеканал «Беларусь 3» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі плануе прадставіць некалькі новых праграм для дзяцей і падлеткаў.**

Падчас цырымоніі падпісання ў Белтэлерадыёкампаніі пагаднення аб супрацоўніцтве міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў падкрэсліў, што стварэнне дзіцяча-юнацкіх праектаў і праграм — гэта складаны працэс, які патрабуе і часу, і намаганняў для ўвасаблення.

— Я рады, што нашы сумесныя праекты будуць рэалізаваны і праграмы ўбачаць тэлегледачы. Пры гэтым будзе ахоплена ўся аўдыторыя — ад малодшых школьнікаў і падлеткаў да студэнтаў і педагогаў, — дадаў кіраўнік ведамства.

Міністэрства адукацыі стала партнёрам трох вялікіх праектаў. Адзін з іх — тэлевізійная адукацыйна-забаўляльная квест-гульня для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Праграма дазволіць пашырыць веды дзяцей пра навакольны свет. Дэвіз праекта: «Быць адукаваным — прэстыжна».

Яшчэ адна праграма ў лёгкай і даступнай форме распавядзе пра маладзёжную навуку, дасягненні беларускіх вучоных.

Таксама плануецца, што Мінадукацыі акажа падтрымку праграме «Размаўляем па-беларуску», якая ўжо выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3». Праграма накіравана на вывучэнне беларускай мовы: удзельнікі тэлевіктарыны адказваюць на пытанні на веданне роднай мовы, літаратуры, этнаграфіі і мастацтва. Пры гэтым яны дэманструюць не толькі свае веды, але і вытрымку, хуткую рэакцыю, рашучасць, уменне дзейнічаць у камандзе і выбудоўваць стратэгію каманднай гульні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# АДУКАЦЫЯ: ЯКАСЦЬ І ДАСТУПНАСЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Наталля Качанава канстатавала, што летась рост злачыннасці сярод непаўналетніх склаў 8,4% . Разам з тым, як паказаў маніторынг, толькі 15% дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, наведваюць гурткі па-за школай. А з дзяцей, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, аб'яднанні па інтарэсах наведваюць усяго 13%.

Спынілася Наталля Качанава і на «праблеме з барадой» — выкананні педагогамі неўласцівых ім функцый:

— На ўзроўні ўрада мы прынялі ўсе меры, якія ад нас залежаць, і паставілі адпаведную задачу перад Міністэрствам адукацыі — зрабіць усё, каб педагогі займаліся толькі сваімі непасрэднымі задачамі і абавязкамі. Але вось зусім свежы прыклад. Адно з раённых упраўленняў адукацыі сталіцы накіравала ва ўстановы адукацыі ліст з інфармацыяй пра запазычанасць грамадзян па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі. Педагогам прапануецца ў рамках «всеобуча» абследаваць умовы пражывання непаўналетніх і правесці тлумачальную работу з бацькамі пра неабходнасць пагашэння запазычанасці па аплаце за паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Скажыце, як гэта разумець? Дапусцім, што дзеці ў такіх сем'ях могуць знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дзякуй за гэты сігнал. Але тлумачальнай работай павінны займацца не педагогі, а тыя, каму належыць! Не трэба даводзіць сітуацыю да абсурду!

У лютым распачынаецца працэдура папярэдняга размеркавання выпускнікоў навучальных устаноў. Па словах Наталлі Качанавай, ёсць інфармацыя з месцаў, што прадпрыемствы і кампаніі адмаўляюцца браць да сябе на працу маладых спецыялістаў.

— Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць працаўладкаванню выпускнікоў, якія навучаліся за сродкі бюджэту. Міністэрства адукацыі павінна ўзяць гэта пытанне на асаблівы кантроль, — падкрэсліла Наталля Качанава.

**«Тлумачальнай работай павінны займацца не педагогі, а тыя, каму належыць! Не трэба даводзіць сітуацыю да абсурду!»**

Разам з тым віцэ-прэм'ер папрасіла кіраўніцтва Міністэрства адукацыі разам з кіраўніцтвам Міністэрства эканомікі яшчэ раз добра прадумаць, колькі абітурыентаў і на якія спецыяльнасці набіраць у гэтым годзе. «Наша задача — рыхтаваць тых спецыялістаў, якія будуць запатрабаваныя на рынку працы», — дадала яна.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ**, які таксама ўзяў удзел у выніковай калегіі Міністэрства адукацыі, падкрэсліў у гутарцы з журналістамі, што Беларусь абрала стратэгію, накіраваную на фарміраванне дзяржаўнасці, незалежнасці, у тым ліку і сістэмы адукацыі, таму нам нельга бяздумна пераймаць замежны вопыт у сферы адукацыі. У краіне праводзіцца мэтанакіраваная праца па захаванні найлепшых традыцый сістэмы адукацыі і найлепшых напрацовак. У той жа час намеснік кіраўніка Адміністрацыі падтрымаў пазіцыю Прэзідэнта, які не аднойчы выказваў пажаданне надаць сістэме адукацыі больш энергічны, дынамічны і паступальны рух. «Неабходна рыхтаваць спецыялістаў, здольных рэагаваць на выклікі часу, для чаго, магчыма, патрабуюцца прынцыпова новыя падыходы», — адзначыў Ігар Бузоўскі. На яго думку, у сістэме адукацыі вельмі важны комплексны падыход, які ўключае як вучэбны, так і выхаваўчы складнік. Гэта, па яго словах, дазволіць сфарміраваць не проста адукаванага чалавека, а асобу і грамадзяніна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Інавацыі

# ЦЕПЛАВАЯ «ЗБРОЯ» СУПРАЦЬ РАКУ

**У БДУ распрацавалі камп'ютарызаваную медыцынскую ўстаноўку агульнай гіпертэрміі «Пціч-М». Апарат прызначаны для комплекснага лячэння розных форм анкалагічных захворванняў у спецыялізаваных клініках.**

Распрацоўка навукоўцаў БДУ забяспечвае высокачастотны нагрэў, кантроль і падтрыманне тэмпературнага профілю цела пацыента ў працэсе працэдуры. Сутнасць агульнай гіпертэрміі заключаецца ў правядзенні сеансу паступовага нагрэву цела пацыента да крытычных тэмператур — 41-42$^0$С. Гэтая працэдура праводзіцца пад наглядам спецыялістаў рознага ўрачэбнага профілю, паколькі пацыент знаходзіцца пад агульным наркозам на працягу двух-трох гадзін. Акрамя таго, адначасова з працэдурай гіпертэрміі, пацыент атрымлівае і медыкаментознае лячэнне — курс хіміятэрапіі. Устаноўлена, што такі комплексны падыход у лячэнні анкахворых асабліва эфектыўны, паколькі лекавыя прэпараты пры адначасовым уздзеянні высокіх тэмператур здольныя «забіваць» ракавыя клеткі ў хворага.

Сама ўстаноўка ўяўляе сабой убудаваны і вынесены камп'ютары, якія ўтвараюць двухконтурную апаратна-праграмную кіравальную сістэму. Яна забяспечвае надзейны аўтаматычны і ручны кантроль усіх рэжымаў дзейнасці медыцынскай установкі. Новая распрацоўка таксама забяспечвае бесперапынную індыкацыю важных для медыкаў параметраў.



Як адзначаюць спецыялісты, камп'ютарызаваная медыцынская ўстаноўка агульнай гіпертэрміі «Пціч-М» даволі дарагая, але ў параўнанні з цэнамі на аналагічныя апараты вытворчасці ЗША, яна таннейшая на некалькі парадкаў.

Зараз «Пціч-М» паспяхова эксплуатуецца ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Тэндэнцыі

# Без выкарыстання — пад знос

## На месцы неэфектыўных камерцыйных аб'ектаў пабудуюць жыллё для шматдзетных

**Яшчэ ў савецкія часы сярод прыватнікаў існавала такое выказванне, што калі нешта агульнае, то значыць нічыё. На тэрыторыі Мінска сёння ёсць шмат акцыянерных таварыстваў і іншых розных структур, якія існуюць выключна на паперы. Гэта высветлілася пасля таго, калі фонд «Мінскгармаёмасць» вырашыў больш пільна прыгледзецца да «пустой» маёмасці горада і навесці ў гэтай сферы парадак. А такіх аб'ектаў «без выкарыстання» назбіралася ў Мінску на пачатак 2015 года ажно 249 пабудоў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Дзяржкаммаёмасці.**

Фонд «Мінскгармаёмасць» узяўся за справу сумесна з адміністрацыямі раёнаў сталіцы, падраздзяленнямі гарадскога ўпраўлення МНС і Мінгарсавета, а ў выніку з чорнага спіса «дрэннай» маёмасці было выключана адразу 127 аб'ектаў усіх формаў уласнасці. Не, не ўсім пабудовам пашанцавала і яны атрымалі новае жыццё, аднак... З іх уліку на 13 аб'ектах завершана ці праводзіцца рэканструкцыя, на 8-мі — пачалося выкарыстанне ўладальнікамі для ўласных патрэб па мэтавым прызначэнні, 7 — адчужаныя, 3 — здадзены ў арэнду, 1 — прыняты ва ўласнасць Мінска, 2 — закансерваваны, а 93 — увогуле цалкам знесены.

Спецыялісты Дзяржкаммаёмасці паведамілі карэспандэнту «Звязды» аб тым, што на гэтых вызваленых пляцоўках плануецца будаўніцтва жылых дамоў па дзяржзаказе і для шматдзетных сем'яў, а таксама рэканструкцыя вулічна-дарожнай сеткі або яе добраўпарадкаванне.

Асобна спынімся на дзяржаўных аб'ектах, якія знаходзяцца ва ўласнасці горада Мінска. Іх было ўсяго 28 — занесеных у графік уключэння ў гаспадарчы абарот на 2015 год. Сёння 9 з іх пачалі ізноў эфектыўна дзейнічаць, а 8 аб'ектаў знесена і закансервавана (61%).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# НА МІЛІЦЫЯНЕРАЎ — З НАЖОМ

**Сяржанты міліцыі Аляксей Дудараў і Павел Падшываленка атрымалі трывожны сігнал падчас свайго дзяжурства. Асуджаны па артыкуле 174 Крымінальнага кодэкса Беларусі за ўхіленне ад утрымання дзяцей бабруйчанін самавольна пакінуў месца абавязковай працы і не думаў вяртацца.**

Супрацоўнікі гомельскай папраўчай установы адкрытага тыпу №17 прыбылі ў Бабруйск, каб вярнуць уцекача на месца, але той прыгразіў ім нажом і збег. Аператыўнікі выклікалі падмогу, і на месца падзей быў накіраваны нарад 3-й асобнай роты палка патрульна-паставой службы УУС Бабруйскага гарвыканкама. Аляксей Дудараў і Павел Падшываленка хутка знайшлі злачынцу па прыкметах. Ён паводзіў сябе неспакойна, а пры затрыманні спрабаваў супраціўляцца. Давялося прымяніць супраць агрэсара сілу.




Фота Таццяны ГАРБАНЮК.

— Бабруйчанін быў затрыманы на працягу 10 хвілін з таго моманту, як паступіў сігнал, — паведаміў **начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый ІГНАТОВІЧ**. — У дачыненні да яго Бабруйскім міжраённым аддзелам СК распачата крымінальная справа па артыкуле 364, якая прадугледжвае пакаранне аж да пазбаўлення волі на тэрмін да шасці гадоў. А сяржантаў міліцыі Аляксея Дударава і Паўла Падшываленку камандаванне патрульна-паставой службы УУС Бабруйскага гарвыканкама збіраецца заахвоціць за іх прафесійныя дзеянні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ЖАНЧЫНУ ДАСТАЛІ З ВАДЫ БУДАЎНІКІ

**У Мінску відавочцы выратавалі жанчыну, якая тануа.**

Гэтае здарэнне ледзь не скончылася бядой на Сляпянскай воднай сістэме каля дома №55 на вуліцы Ваньковіча. А палове дзясятай раніцы відавочцы паведамілі ў Мінскае гарадское ўпраўленне МНС, што тут тоне чалавек. Аднак яшчэ да прыбыцця выратавальнікаў жанчыну выцягнулі з вады. Гэта зрабілі рабочы-фасадчык і машыніст пагрузчыка, якія праводзілі будаўніча-мантажныя работы на новабудоўлі на вуліцы Філімонава. Папярэдне мяркуецца, што пацярпелая — абходчык гідратэхнічных збудаванняў — пры правядзенні работ па прыборцы канала паслізнулася і ўпала ў ваду. Жанчыну пасля агляду медыкамі шпіталізавалі з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ГУЛЬНЯ Ў ПОКЕР «ПАЦЯГНУЛА» НА 39 МЛН РУБЛЁЎ

**Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) па горадзе Мінску спецыяльнымі мерапрыемствамі выявіла жыхара сталіцы, які атрымліваў даходы з-за мяжы, але дзяліцца з дзяржаваю гэтымі грашыма не збіраўся.**

Увогуле, спецыялістамі было ўстаноўлена, што грамадзянін З. на працягу 2013-2014 гадоў атрымліваў даходы ад замежнай кампаніі з-за межаў краіны ў выглядзе выйгрышаў у інтэрнэт-покер электроннымі грашыма, якія паступалі на яго электронны кашалёк. Аднак удалы гулец падатковых дэкларацый па выніках года не запаўняў, а сталічную інспекцыю проста не наведваў. Сціпласць прасунутага карыстальніка глабальнай сеткі была ацэнена экспертамі МПЗ адразу па трох артыкулах Падатковага кодэкса Беларусі.

А потым, па выніках праверкі, яму было прад'яўлена да аплаты сума ў 38,9 млн рублёў. З гэтай сумы толькі падаходны падатак склаў 32,6 млн рублёў. Акрамя таго, фізічная асоба прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 3,3 млн рублёў.

Спецыялісты падатковай службы яшчэ раз нагадваюць, што да першых дзён вясны пэўная катэгорыя работнікаў павінна абавязкова падаць дэкларацыю аб даходах за мінулы год. У любым выпадку гэта неабходна зрабіць тым, хто атрымліваў даходы за мяжой або з-за мяжы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Энергабяспека

# СВОЙ МЕГАВАТ ТАННЕЙШЫ

## У новай пяцігодцы ў краіне павялічаць долю выкарыстання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў

**На пасяджэнні пашыранай калегіі Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі падводзіліся вынікі працы за мінулую пяцігодку. Дырэктар Дэпартамента Міхаіл МАЛАШАНКА, разглядаючы ход выканання заданняў, устаноўленых Дзяржаўнымі праграмамі ў сферы энергазберажэння і павелічэння выкарыстання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў, адзначыў, што ўсе асноўныя паказчыкі былі выкананы. Ён агучыў і задачы на 2016 год.**

### Энергаёмістасць ВУП, як у Канадзе

Зніжэнне энергаёмістасці за пяцігодку склала 12,6%. Доля мясцовых энергарэсурсаў у кацельна-пячным паліве пры мінімальным заданні ў 28% і максімальным у 30% за гэты тэрмін склала 29,5%. Эканомія энергарэсурсаў па рэспубліканскім мінімальным заданні ў 7,1 млн тон умоўнага паліва і максімальным у 8,8 млн тон выканана на ўзроўні больш за 7,8 млн тон. Выйсці на такія паказчыкі стала магчымым дзякуючы планамернаму павелічэнню аб'ёму мясцовых энергарэсурсаў у кацельна-пячным паліве, пачынаючы яшчэ з 2005 года, а таксама дзякуючы зніжэнню ўзроўню спажывання энергарэсурсаў па краіне. За дзесяць гадоў энергаёмістасць ВУП знізілася больш чым у 2,2 раза, а гэта азначае, што яна стала блізкая да паказчыкаў Фінляндыі і Канады.

Разам з тым, не ўсё ідзе гладка. Напрыклад, з задачамі па энергазберажэнні на 2015 год не справіліся Гомельская і Гродзенская вобласці, дзе не сэканомілі паліўна-энергетычныя рэсурсы. У выніку Гомельская вобласць выканала 82% ад плана на 2015 год, Гродзенская — 76%. У Брэсцкай вобласці самае вялікае невыкананне паказчыка ўкаранення новых энергакрыніц. За пяцігодку там планавалася ўвесці ў строй 15, а атрымалася толькі 11.

### Ёсць умовы — будзе і інвестар

У задачах мінулай пяцігодкі таксама было пазначана ўвесці такія сучасныя і экалагічныя крыніцы атрымання энергіі, як біягазавыя комплексы. Згодна з планамі, іх павінны былі пабудаваць 32 сумарнай магутнасцю ў 35 МВт. Аднак увялі толькі 12 на 18 МВт. Каментуючы гэтую сітуацыю, Міхаіл Малашанка адзначыў, што з прычыны вялікага памеру капіталаўкладання ў будаўніцтва гэтых комплексаў (больш за 4 тысячы долараў за 1 кВт*г устаноўленай магутнасці), аб'екты былі рэалізаваны з прыцягненнем уласных сродкаў і рэсурсаў рэспубліканскага бюджэту. Інвестар на гэтыя аб'екты не прыйшоў.

«Аднак пасля таго, як уступіў у сілу Указ №209 «Аб аднаўляльных крыніцах энергіі», сітуацыя змянілася. Ён прадугледжвае нязменнасць павышальных каэфіцыентаў для інвестараў на перыяд у 10 гадоў. Цяпер каля 16 МВт па біягазавым энергакомплексе не выкананы. Але на комплексы сумарнай магутнасцю ў 31 МВт ужо прыйшлі інвестары, якія будуць займацца будаўніцтвам да 2018 года. Гэта азначае, што першапачатковы паказчык будзе хутчэй за ўсё перавыкананы на працягу бліжэйшых трох гадоў», — растлумачыў кіраўнік дэпартамента.

### Амбіцыйная пяцігодка

Асноўнымі задачамі на будучую пяцігодку будуць стрымліванне росту спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў, а таксама далейшае павелічэнне выкарыстання мясцовых рэсурсаў і аднаўляльных крыніц энергіі. Доля першаснага паліва ў валавым спажыванні энергарэсурсаў краіны павінна скласці 16%. У тым ліку доля мясцовага паліва ў энергіі павінна быць на ўзроўні 6% ад агульнага спажывання. Інфраструктурныя планы таксама амбіцыйныя: у эксплуатацыю павінны ўвесці 690 МВт цеплакрыніц, якія выкарыстоўваюць мясцовыя віды паліва, ГЭС агульнай магутнасцю каля 80 МВт, фотаэлектрычныя станцыі сумарнай магутнасцю 250 МВт, ветрапаркі — 200 МВт. Прадоўжацца работы і з біягазавымі комплексамі на ачышчальных збудаваннях і палігонах адходаў у сельскагаспадарчых арганізацыях, якія займаюцца развядзеннем буйной рагатай жывёлы, свіней і птушак. Іх сумарная магутнасць павінна скласці не менш за 30 МВт.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Праверка паказала

# ЧАМУ САЛЯРКА ЗАМЯРЗАЕ?

## Таму што не адпавядае тэхрэгламенту

**У зімовы перыяд пры рэалізацыі і эксплуатацыі дызельнага паліва варта ўлічваць тэмпературныя ўмовы і выбіраць адпаведны від паліва. Да такой высновы прыйшлі ў Дзяржстандарце па выніках праверак якасці дызельнага паліва, якое рэалізуецца на аўтазаправачных станцыях краіны.**

— Абласныя інспекцыі Дзяржстандарта правялі кантрольна-наглядныя мерапрыемствы па выкананні патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА) па стандартызацыі і заканадаўства на 29 аўтазаправачных станцыях, якія адносяцца да розных суб'ектаў гаспадарання. Было адабрана і накіравана на выпрабаванні ў акрэдытаваныя лабараторыі прыкладна 60 узораў дызельнага паліва. Вынікі паказалі, што ў асноўным узоры адпавядаюць патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб патрабаваннях да аўтамабільнага і авіяцыйнага бензіну, дызельнага і суднавага паліва, паліва для рэактыўных рухавікоў і мазуту» (ТР МС 013/2011), — адзначыў **намеснік старшыні Дзяржстандарта Сяргей ІЎЛЕЎ.**

Разам з тым, ён растлумачыў, што ў ходзе праверак былі ўстаноўлены парушэнні, звязаныя з прадастаўленнем спажыўцам недакладнай інфармацыі аб паліве, што ўводзіла іх у зман. Напрыклад, на АЗС у Магілёве і Полацку на паліўна-раздатачным абсталяванні была ўказана марка дызельнага паліва, якое адносіцца да зімовага, пры гэтым рэалізоўвалася міжсезоннае паліва. У Гомелі і Добрушскім раёне былі выяўлены аналагічныя парушэнні: не пазначаны кліматычныя ўмовы прымянення дызельнага паліва (летняе, міжсезоннае, зімовае, арктычнае), а таксама ўказана марка сорт С замест рэалізуемага сорт F.

Так, за выяўленыя парушэнні ў дачыненні да суб'ектаў гаспадарання былі складзены і накіраваны ў суды пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях, выдадзены прадпісанні і рэкамендацыі аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

Як адзначылі ў камітэце, вынікі праведзеных праверак дазваляюць выказаць меркаванне, што найбольш верагодны прычынай скаргаў спажыўцоў на дызельнае паліва, якое замярзае, стала рэалізацыя і эксплуатацыя ў краіне міжсезоннага і зімовага дызельнага паліва пры тэмпературы, ніжэйшай за гранічна дапушчальную ТР МС 013/2011 для гэтых відаў. «У зімовы перыяд і вытворцам, і аўтазаправачным станцыям, і спажыўцам рэкамендуецца ацэньваць тэмпературу паветра і выбіраць адпаведны від паліва. Вытворцы і аўтазаправачныя станцыі павінны прадастаўляць спажыўцам поўную і дакладную інфармацыю аб прапанаванай прадукцыі», — падкрэсліў Сяргей Іўлеў.

Нагадаем, што ў Дзяржстандарт паступіла прапанова канцэрна «Белнафтахім» аб правядзенні праверак якасці дызельнага паліва, якое рэалізуецца на аўтазаправачных станцыях краіны. Падставай для гэтага паслужылі звароты грамадзян, якія паступілі ў канцэрн.

**Дар'я ШОЦІК**

# Тры мільёны на сукенку...

### БЛІСКУЧЫЯ ПАДШЭЎКІ І ЦЭЛАФАНАВЫ ГУК

Пачаць агляд мы вырашылі з адзення з сярэднім коштам. Спыняемся каля стэнда з касцюмамі. Юлія бярэ пінжак гарчычнага колеру за 729 тысяч рублёў.

— 69 працэнтаў шэрсці, паліэстар і эластан. Для жакета склад цудоўны. Сама па сабе тканіна вельмі цікавая. Тут нават падшэўка радуе мяне: вытворцы пачалі разумець, што адзенне знутрыззяць не павінна. Гэтыя бліскучыя падшэўкі — яны могуць любую рэч сапсаваць.

Праўда, для вельмі адчувальных людзей шэрсць не лепшы варыянт. Каб праверыць, ці няма ў вас на яе алергіі, наш эксперт раіць правесці па тканіне запясцем.

— А тут заяўка на дызайн, — Юлія разглядае шарсцяны жакет светла-ружовага колеру за 663 тысячы. — Гэта модна — абразныя краі. Рэч пашыта са скачанай воўны, сыпацца не будзе.

Мы задаволены: сярод вешалак з адзеннем па дэмакратычных коштах, як цяпер любяць казаць, ёсць годныя варыянты. І пераплачваць не давядзецца.

Шукаем вопратку даражэйшую. На вочы трапляецца сукенка з белым каўнерыкам і доўгімі рукавамі. Прапануюць за мільён. Юлія вывучае этыкетку:

— 75 працэнтаў паліэстара, 25 віскозы... Я не сказала б, што гэта дрэнны састаў. Пашыта па стандартных параметрах, усё зроблена па правілах. Адкрытыя швы... У дарагіх рэчаў вытворца максімальна закрывае адварот, але гэта не абавязкова. Добра, што бавоўняны каўнерык і манжэты на рукавах адшпільваюцца, каб можна асобна памыць. Гэтая сукенка адэкватная свайму кошту.

Пакуль блукаем між радамі, пытаемся: а што ў прынцыпе не можа быць танным? Дызайнер кажа, што любыя рэчы з натуральных тканін — шоўку, шэрсці, кашаміру. Праўда, гэтыя матэрыялы складаныя для ўжывання ў масмаркеце. Вытворцы працуюць у асноўным са змешанымі тканінамі ці 100-працэнтнай сінтэтыкай — толькі таму, што догляд за імі на парадак прасцейшы. Той жа шоўк — гэта толькі хімчыстка.

Праўда, сінтэтычныя тканіны, заўважае наш эксперт, таксама розныя бываюць. Многія брэнды, якія выпускаюць рэчы за тысячы долараў, цяпер выкарыстоўваюць паліэстар. Але вы ніколі не здагадаецеся, што гэта ён, бо якасць — на ўзроўні шоўку. Пры выбары адзення з сінтэтычных матэрыялаў Юлія раіць давярацца сваім адчуванням:

— Ці камфортна вам, ці не хрусціць. Чаму кажуць «шкляное адзенне»? У паліэстара ёсць свой гук, падобны да цэлафану. У якасных сукенках яго быць не павінна. Але гэты крытэрый не тычыцца тканін, дзе ёсць сумесь шоўку ці бавоўны з паліэстарам: там такі гук атрымліваецца за кошт фактуры.

### СПАДНІЦА З ПЛІСЭ ТАННАЙ НЕ БУДЗЕ

На адной з вешалак заўважаем жоўты жакет з нашытымі збоку кветкамі. На цэнніку — 1 мільён 451 тысяча. Склад — віскоза і паліэстар.

— Напэўна, за элементы дэкору цану павысілі, — крытычна разглядае жакет наш эксперт. — Калі ставіць падшэўку ў «турэцкія агуркі», як тут, гэта канец свету. Гэта нацыянальны ўсходні прынт. Таму калі ён выкарыстоўваецца ў класічным касцюме, у мяне ўзнікае пытанне: з якой мэтай?

Сукенку за мільён з тканіны, якая імітуе замшу, Юлія таксама не ўхваліла.

— Вось эка-скуру цяпер робяць так, што адрозніць яе ад сапраўднай непрафесіяналу вельмі цяжка. Але ў выпадку з замшай не дайшлі яшчэ да таго ўзроўню вытворчасці, каб яна была падобнай да натуральнай. Гэта асабіста мая думка, але імітацыя матэрыялу — на 50% правал.

Яшчэ адзін пінжак па крої апынуўся вельмі падобным да таго светла-ружовага, што мы бачылі раней. Праўда, каштаваў у чатыры разы даражэй. Дый матэрыял іншы: шэрсці толькі 20%. Карацей, першы варыянт за 600 тысяч адназначна лепшы. Сукенку з шытага трыкатажу, якая вісела побач, прадавалі за 2,8 мільёна. «Для масмаркета гэта шмат», — заўважае дызайнер.





Фота Надзеі БУЖАН.

69 працэнтаў шэрсці і неблішчучая падшэўка — добры варыянт.

Сярод дарагіх рэчаў Юліі спадабалася шэрая спадніца-мідзі (2,3 мільёна):

— Сімпатычная рэч. Гэта таксама трыкатаж, але гафрэ, плісэ заўсёды павышаюць кошт. На якой бы тканіне гэта ні было зроблена.

— Гэта значыць, тут кошт можна апраўдаць?

— У прынцыпе, так.

### САМЫЯ НЕПРАДКАЗАЛЬНЫЯ РЭЧЫ — ВЯЗАНЫЯ

Распаўсюджаная праблема світараў — выцягнутыя локці. Цікавімся, як выбраць такі, дзе б рукавы не страцілі форму.

— Вы ведаеце, гэта непазбежна, — адказвае дызайнер. — Тут ні пры чым ні гатунак ніткі, ні пры чым ні якасці ніцак, ні да чаго. Нават у мегадарагіх брэндаў з трыкатажам можа адбыцца што заўгодна. Тут больш уплывае стаўленне чалавека: як ён даглядае рэч, як носіць. Але калі ў складзе ёсць натуральны матэрыял, ад цёплага ўздзеяння прасам тканіна на локцях павінна сабрацца назад. Калі рэч цалкам сінтэтычная, ідэальную форму рукава прасам не вернеш. У трыкатажы, мне здаецца, самае галоўнае — дызайн.

Ад галушачак, на жаль, таксама не застрахуешся. Збірацца ў маленькія шарыкі на рэчы можа і якасная шэрсць, і паліэстар. Вязаныя рэчы ўвогуле непрадказальныя. Але калі правільна даглядаць, вопратка праслужыць даўжэй. У выпадку з вязкай — толькі ручное мыццё. Нямоцна адціскаць, для сушкі раскладаць на пляшку ці ручнік. Толькі ў гэтым выпадку выраб не будзе дэфармавацца.

Мы тым часам ацэньваем кофты з катэгорыі «Усё па 300». Кажуць, ад адзення за такі кошт шмат не трэба чакаць: некалькі разоў апрануў і купляй новае.

— Вядомы факт, што ў падобных рэчаў кароткі тэрмін эксплуатацыі. Як і ва ўсіх вядомых сусветных масмаркетаўскіх брэндаў, — каментуе наш эксперт. — Тыя, хто іх робіць, навучыліся падглядаць дызайн. Але я не купляла б рэч нявартай якасці — гэта вельмі заўважна. Танныя вырабы не маюць нармальнай пасадкі, заўсёды дзіўнай даўжыні і сумнёўнай апрацоўкі.

Што маем на выхадзе? Натуральных тканін у чыстым выглядзе, якія апрыёры дарагія, мы ў краме не ўбачылі. Часцей высокі цэннік выстаўляюць за дызайнерскую думку. Бо, калі распрацоўваецца арыгінальная мадэль, прыцягваецца больш людзей, могуць ладзіцца паказы. Шмат выдаткаў на адну адзінку адзення. А што да якасці... Лепш чытайце этыкеткі, а не арыентуйцеся на кошт.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 ЛЮТАГА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15787)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

PROSSPEKT:

# «Галоўнае — не страціць самабытнасць»

**Беларускі гурт PROSSPEKT ужо два гады жыве і працуе за акіянам, у Амерыцы. Нядаўна ён завітаў у Беларусь, каб не толькі пабачыцца з сябрамі і роднымі, але і прэзентаваць сваю новую песню «Sigh not so» і відэакліп на яе. З гэтай кампазіцыяй калектыў заняў другое месца на конкурсе брадвейскага тэатра «Wyrld» у Нью-Ёрку. У выніку ім удалося не толькі папоўніць свой рэпертуар, але і папрацаваць з прадзюсарам Шонам Джылем, які запісваў Мадонну, гурт Korn, Beyonce, Sher і іншых вядомых артыстаў. Пра тое, які вопыт ім гэта дало і як змяняецца жыццё, калі не баішся рабіць крокі да сваёй мары, мы распыталі салістаў гурта Мікалая Знахарчука і Вольгу Палюшык.**

**В.:** — На конкурс мы трапілі пазалетась выпадкова. Упершыню сутыкнуліся з сітуацыяй, калі на руках быў напісаны тэкст (і не кім-небудзь, а самім Уільямам Шэкспірам) і трэба было на яго аснове зрабіць песню. Мы падумалі, а чаму б не паспрабаваць сябе ў чымсьці новым?..

**М.:** — Па ўмовах трэба было напісаць музыку для спектакля. Аднак нам захацелася зрабіць нешта незвычайнае. Не проста па стылістыцы адпаведнае Сярэднявечч у і эпосе Шэкспіра, а больш сучасную кампазіцыю. Усё атрымалася здзейсніць за адзін вечар. Я зрабіў накіды музыкі, Вольга адрэдагавала. І практычна адразу пасля конкурсу, назіраючы за рэакцыяй публікі, мы зразумелі, што песня вартая, каб запісаць яе і зняць кліп. Выконваючы кампазіцыю на сваіх канцэртах, пераканаліся, што гучыць яна паўнацэнна і нельга такі матэрыял губляць.

**В.:** — Песня не характэрная для нашай творчасці, але, натхнёныя класікам, мы звярнуліся да беларускага саўндпрадзюсара Юрыя Сямко, з якім працавалі над сваім першым альбомам, і ён надаў ёй электроннае гучанне. А потым мы яе запісалі на добрай студыі з вядомым прадзюсарам Шонам Джылем.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Медагляд

# «АДСУТНІЧАЎ З УВАЖЛІВАЙ ПРЫЧЫНЫ...»

## БОЛЬШ ЗА ЎСІХ ХВАРЭЮЦЬ СТУДЭНТЫ-ЭКОЛАГІ І ТЭХНОЛАГІ

**Ці часта моладзь «сядзіць на даведцы»? Колькі каштуе аздаравіцца ў прафілакторыі? І каму могуць дазволіць не хадзіць у басейн? На гэтыя пытанні нам адказалі ў 33-й гарадской студэнцкай паліклініцы.**

### Лячэбны эфект адпрацовак

Летась даведку па часовай непрацаздольнасці браў кожны трэці сталічны студэнт, замацаваны за паліклінікай. У параўнанні з папярэднім годам моладзь хварэла часцей.

Сярэдняя працягласць непрацаздольнасці — 6,5 дня. «Гэта не так шмат, — адзначае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі Людміла КАЗЛОВА.** — Калі параўноўваць з дарослым насельніцтвам ці з дзецьмі, там паказчык значна вышэйшы».

Часцей хварэлі студэнты Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта імя Сахарава, тэхналагічнага ўніверсітэта і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Радзей за астатніх у паліклініку звярталіся з аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, акадэмій музыкі і мастацтваў. У гэтых ВНУ на чалавека прыпадае менш за 1,5 прапушчанага дня. Чаму звесткі так адрозніваюцца? Людміла Мікалаеўна лічыць, што рэдка хварэюць там, дзе цяжкія адпрацоўкі. А калі выкладчыкі ставяцца да пропускаў лаяльна, маладыя людзі могуць дазволіць сабе лішні дзень «пабыць на даведцы».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пазнаёміцца з прафесіяй

# ГЛАЗУРА ДЛЯ «БІСКВІТУ»,

## або Навошта мастаку пластылін

**Калі чалавек называе сябе скульптарам, гэта часцей за ўсё выклікае асацыяцыі з творцамі, якія ўпрыгожваюць гарады сваімі манументальнымі работамі. Але ёсць і іншыя прадстаўнікі прафесіі, чые творы, няхай і не такія вядомыя, знаходзяць сваё месца ў тысячах кватэр. Малады мастак-скульптар Добрушскага фарфоравага завода Ігар НІКАЛАЕЎ з іх шэрагу. Пра сваю працу і жыццёвыя прынцыпы хлопец распавёў нашаму карэспандэнту.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Ігар дэманструе першую работу, распісаную ўручную.

Ігара мы заспяваем на працоўным месцы — у невялікім кабінеце, схіліўшы над сталом галаву, хлопец шчыруе над новай скульптурай — невялікім пеўнікам, які трымае ў «руках» гармонік. Гэта стварэецца сімвал ужо будучага года. Здымаць на камеру нарыхтоўку не дазваляюць — да пачатку вытворчасці любая ідэя застаецца камерцыйнай тайнай прадпрыемства.

— Насамрэч, у Добрушы я не так даўно, — расказвае ён. — Сам родам з Расіі, з Варкуты. Маці — карэнная дабрушанка, яшчэ ў савецкія часы пераехала на поўнач працаваць настаўніцай у пачатковай школе. А бацька быў заняты на тамтэйшых вугальных шахтах. Я з дзяцінства маляваў, хадзіў у мастацкую школу, таму заўсёды ведаў, што буду займацца мастацтвам. Але на далёкай поўначы Расіі адукацыйныя ўстановы з творчымі спецыяльнасцямі — не самая распаўсюджаная з'ява. Таму вырашыў вярнуцца на радзіму маці, балазе, тут заставалася бабуля.

Пасля пераезду ў Добруш Ігар паступіў у Гомельскі дзяржаўны мастацкі каледж на спецыяльнасць «станковы жывапіс». Чатыры гады навучання скончыліся размеркаваннем у Калінкавіцкую дзіцячую мастацкую школу, дзе хлопец выхаваўся маляванню.

— Педагагічны досвед мне не вельмі спадабаўся, — згадвае суразмоўца. — Два гады адпрацаваў, але заўжды разумеў, што гэта не маё. Знайсці працу па спецыяльнасці не так проста, але варыянты заўсёды ёсць. Спачатку схадзіў на папяровую фабрыку — не было месцаў. Потым прыйшоў сюды. Вядома, пра фарфор у мяне ніякага ўяўлення не было, бо спецыяльнасць — выключна мастацкая. Але кіраўніцтва вырашыла паспрабаваць навучыць мяне ўсяму, што трэба. Вельмі моцна дапамагла наш начальнік мастацкай лабараторыі Ганна Гагалушка, увесь час падтрымлівала.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Знаходзіць той, хто шукае*

# ПРАЦА, ПАЧАКАЙ, ДАЙ АДПАЧЫЦЬ!

## Як моладзь бавіць вольны час

**Кар'ера стаіць на адным з першых месцаў сярод жыццёвых прыярытэтаў у сучаснай моладзі. Хлопцы і дзяўчаты ўзростам крыху за дваццаць гатовыя шмат працаваць дзеля самарэалізацыі і грошай (без іх жа нікуды). Але для таго, каб намаганні былі паспяховымі, неабходна добра адпачываць. Мы папрасілі траіх маладых спецыялістаў расказаць, як яны звычайна бавяць свой вольны час і што дапамагае ім аднавіць сілы перад чарговым працоўным тыднем.**

**Сталічны інжынер-праграміст Павел СТОЛЯР** на выхадных рэдка застаецца дома:

— Як і многія хлопцы, яшчэ са школьных часоў люблю футбол. З задавальненнем гуляў у яго ва ўніверсітэце. Час ад часу мы і цяпер з сябрамі збіраемся паганяць мяч, толькі ўжо не на студэнцкім стадыёне, а ў межах спаборніцтваў за Кубак Мінска. Акрамя гэтага, я гуляю ў аматарскай камандзе футбалістаў, якая склалася на інтэрнэт-форуме некалькі гадоў таму з фанатаў футбольнага клуба «Ювентус».

Значную частку свайго вольнага часу Павел прысвячае папулярнай прыгодніцка-інтэлектуальнай гульні «Схватка», яна звычайна адбываецца ў ноч з суботы на нядзелю:

«Тут і набегаешся, і мазгі свае напружыш, а цемра толькі дадае экстрыму. Карацей, цудоўны адпачынак для тых, хто сядзіць у офісе з панядзелка да пятніцы».

Ёсць у Пашы і яшчэ адзін спосаб для рэлаксацыі: па магчымасці ён наведвае ўсе гульні ліг КВЗ, якія ладзяцца ў Мінску. «Класічны гарадскі адпачынак — паходы ў кіно і тэатр — таксама здараецца ў маім жыцці. Праўда, не так ужо і часта», — дадае малады праграміст.

**Вераніка ТРЫНКІНА жыве ў Мастах Гродзенскай вобласці ўжо паўгода.** Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта дзяўчына прыехала сюды працаваць па размеркаванні ў рэдакцыю мясцовай газеты. У першыя месяцы яна кожныя выхадныя ездзіла да бацькоў у Слонім, бо проста не ведала, што рабіць адной у чужым горадзе.



**Форма каманды, у якой гуляе Павел Столяр *(у сярэдзіне)*, зроблена ў колерах любімага футбольнага клуба.**

— Але паколькі я аптыміст, то хутка перагледзела сваё стаўленне да сітуацыі. Каб не марнаваць вольны час, запісалася ў аўташколу. Вучылася кіраваць аўтамабілем, а задно з мясцовацю і людзьмі знаёмілася, — расказвае Вераніка. — Такім чынам, скарацiла гадзіны да суму. Яшчэ вечарамі выходзіла на прагулкі ўздоўж Нёмана.

Атрымаўшы пасведчанне кіроўцы, Вераніка знайшла сабе новае хобі — заняткі ў школе прыгажосці, дзе навучылася некаторым дзявочым сакрэтам. Цяпер яна плануе запісацца на курсы па вязанні, бо лічыць, што «вяжуць не толькі бабулькі», і гэты навык спатрэбіцца ёй у жыцці.

Адзначае Вераніка і яшчэ адзін вялікі плюс маленькага горада — тут у параўнанні з Мінскам усё каштуе ў разы танней. Маладыя спецыялісты атрымліваюць не так ужо і шмат, але ёй хапае гэтых грошай і на тое, каб здымаць асобную кватэру, і на ўласныя інтарэсы. Неверагодным адкрыццём для дзяўчыны сталі мясцовыя кавярні: «Хоць кожны дзень хадзі туды снедаць і вячэраць, на твой бюджэт гэта зусім не паўплывае! Па кошце выходзіць нават танней, чым дадому прадуктаў купіць. Але я люблю сама гатаваць».

**У аграгарадок Суботнікі, што ў Іўеўскім раёне, Юлія ДРАБОВІЧ патрапіла на працу па размеркаванні пасля каледжа.** Яна — эканаміст у СВК «Умястоўскі» і завочна вучыцца ў Палескім дзяржаўным універсітэце.

— Мой вольны час — гэта выхадныя, у будні пасля працы звычайна хапае заняткаў па доме: прыгатаваць паесці, прыбрацца, нешта памыць. Таксама рыхтуюся да сесіі. А вось у суботу і нядзелю збіраемся з дзяўчатамі-калегамі, гарбату п'ём, размаўляем. Карацей, нічога асаблівага, — распавядае Юля. — Дыскатэка, здаецца, праводзіцца ў мясцовым ДК, але туды не цягне. У каго ёсць аўтамабіль, той едзе ў горад. У мяне такой магчымасці няма...

Здараецца, выхадныя дзяўчына праводзіць каля камп'ютара. Таму можна сказаць, што інтэрнэт — выратаванне для вясковай моладзі. У некаторай ступені ён замяняе бібліятэку, кінатэатр і рэальныя размовы з равеснікамі, бо як ні круці, а ў вёсцы маладых катастрафічна не хапае.

— З іншага боку не ўсё так дрэнна. Кіраўніцтва нашага СВК і Іўеўскі райвыканкам бачаць праблему і робяць пэўныя крокі, каб прыцягнуць моладзь і зрабіць цікавым яе вольны час. Я кажу так таму, што за паўтара года, што тут працую, адчула гэта на сабе. Напрыклад, летам мы з калегамі ездзілі на раённы турзлёт. А на Дзень горада менавіта маладыя супрацоўнікі з розных вёсак прадстаўлялі свае СВК, — дзеліцца Юля. — Напэўна, самай запамінальнай стала экскурсія па Гродзеншчыне, падчас якой я яшчэ больш зблізілася са сваімі калегамі. Мы ехалі ў аўтобусе і спявалі песні, жартавалі. Дарэчы, карпаратывы ў нас заўжды праходзяць весела і доўжацца да самага ранку.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка IV курса**
**Інстытута журналістыкі**
**БДУ.**

# «АДСУТНІЧАЎ З УВАЖЛІВАЙ ПРЫЧЫНЫ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сярод прычын агульнай захваральнасці лідзіруюць хваробы органаў дыхання: ВРВІ, ВРЗ, пнеўманія, ангіна, атыт. Доля такіх выпадкаў — 76 працэнтаў. На другім месцы траўмы, на трэцім — хваробы органаў стрававання. Амаль на палову, у параўнанні з 2014 годам, вырасла частата захворванняў вуха, на трацiну — нервовай сістэмы.

Замежныя студэнты па даведкі звяртаюцца радзей. Але не таму, што ў іх імунітэт мацнейшы.

— Медыцынскае абслугоўванне для іх платнае, — тлумачаць у паліклініцы. — Напрыклад, цалкам увесь медыцынскі агляд, які замежнікі абавязаны прайсці на першым курсе, каштуе каля мільёна. Таму не ўсе хочуць абследавацца. Запускаюць захворванні.

## Без «фізры» немагчыма

Увогуле, ці шмат у нас здаровых студэнтаў? Па выніках штогадовых медыцынскіх аглядаў, абсалютна здаровымі лічацца 28 працэнтаў. Яшчэ палова не мае ніякіх хранічных захворванняў, але ёсць фактары рызыкі. Інвалідаў сярод навучэнцаў універсітэтаў — паўпрацэнта. З года ў год гэтыя суадносіны амаль не мяняюцца.

30 працэнтаў з усіх агульных захворванняў складаюць міяпіі (пагаршэнне зроку).

**Рэдка хварэюць там, дзе цяжкія адпрацоўкі. А калі выкладчыкі ставяцца да пропускаў лаяльна, маладыя людзі могуць дазволіць сабе лішні дзень «пабыць на даведцы».**

Часта ў моладзі сустракаюцца скаліёзы, парушэнні пастаці, артрозы. Нярэдка выяўляюцца і хваробы сістэмы кровазвароту (пралапс мітральнага клапана, артэрыяльная гіпертэнзія, парушэнне рытму).

Трапіўшы ў кабінет да намесніка галоўнага ўрача, не маглі не спытаць пра мару многіх студэнтаў: як атрымаць вызваленне ад фізкультуры?

— Гэта амаль немагчыма, — адказвае Людміла Мікалаеўна. — Фізкультура ва ўніверсітэце — такая ж самая дысцыпліна, як фізіка ці хімія. Ад практычных заняткаў па фізічным выхаванні мы вызваляем толькі інвалідаў і студэнтаў з вострымі працяглымі захворваннямі і траўмамі (на перыяд хваробы і рэабілітацыі). Такіх адзінкі.

Даведку, якая дазваляе не хадзіць у басейн, таксама выдаюць вельмі рэдка. Як правіла, вызваляюць тых, у каго ёсць скурныя захворванні ці алергія на хлор. Або цяжкая форма бранхіяльнай астмы і праблемы з сэрцам. Праўда, дзяўчаты, што баяцца сапсаваць прычоску (потым на пары ў такім выглядзе?), якія толькі прычыны не прыдумляюць!.. Часцей за ўсё спасылаюцца на сутаргавыя сімптомы. Ці кажуць, што, бывае, страчваюць прытомнасць (для басейна гэта насамрэч супрацьпаказанне: чалавек можа захлынуцца).

— Мы потым сталі папярэджваць: добра, паверым вам і правядзём абследаванне ў неўролага. Але як толькі ў картцы з'явіцца запіс пра непрытомны стан, кіроўцам чалавек ужо не будзе. Варыянт «я вады баюся» таксама не пройдзе: у нас псіхатэрапеўт працуе, — распавядае намеснік галоўнага ўрача.

## А абед — па распарадку

Каб прывучыць моладзь да правільнага ладу жыцця, з 2013 года студэнцкая паліклініка, гарадскі цэнтр здароўя і БДУІР запусцілі спецыяльны праект. Старастаў груп першых курсаў навучаюць асновам здаровага ладу жыцця, а тыя потым кансультуюць сваіх аднагрупнікаў. Так карысней інфармацыяй паступова будуць ахоплены ўсе студэнты ўніверсітэта. Матывацыя для старастаў — квіткі на харчаванне. Кажуць, дзейсна. Летась да праекта далучыліся і іншыя ўстановы: БДТУ, БДУКМ, Акадэмія мастацтваў, Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці, філіял Расійскага сацыяльнага ўніверсітэта.

Для прыкладу, даюцца рэкамендацыі па харчаванні. Маладым людзям са здаровым страўнікам раяць есці мінімум чатыры разы на дзень. Чалавеку, не занятаму фізічнай працай, у дзень трэба спажываць у сярэднім 2100 кілакалорый. У залежнасці ад таго, трэба студэнту пахудзець ці паправіцца, спецыялісты падказваюць, як скарэкціраваць рацыён. Самымі сытнымі мусяць быць сняданак і абед. Лёгкую вячэру лепш планаваць на 19 гадзін. І ніякіх камп'ютараў і смартфонаў перад сном — каб не ўзбуджаць нервовую сістэму і зранку прачнуцца са здаровай галавой.

Цікавімся, ці актуальна для цяперашніх студэнтаў праблема атлусцення.

— У кагосьці залішняя вага, а ў кагосьці, наадварот, — недахоп, — заўважае Людміла Мікалаеўна. — Дзяўчаты, якія сочаць за фігурай, часам настолькі сябе абмяжоўваюць у ежы, што даводзіцца адпраўляць іх да псіхатэрапеўта і прызначаць зондавае харчаванне.

Падправіць здароўе студэнты могуць у прафілакторыях. Такую магчымасць прапаноўваюць шэсць сталічных універсітэтаў: БДУ, БНТУ, эканамічны, тэхналагічны, медыцынскі і педагагічны. Усяго 7,3 тысячы месцаў, якія штогод на 100 працэнтаў запаўняюцца. У першую чаргу на аздараўленне накіроўваюць моладзь з хранічнымі захворваннямі. Калі застаюцца пуцёўкі, іх прапануюць студэнтам, якія часта «сядзелі на даведцы» (напрыклад, з прычыны прастуды).

У кожным прафілакторыі ёсць фізіятэрапеўтычныя аддзяленні, ванны, працуюць інструктары па лячэбнай фізкультуры і масажысты. Але часцяком студэнты, магчыма, у сілу сваёй занятасці, карыстаюцца толькі квіткамі на харчаванне і не ходзяць ні на якія працэдуры.

Пуцёўкі амаль цалкам фінансуюцца дзяржбюджэтам. Студэнту за змену, якая доўжыцца 18-21 дзень, трэба заплаціць толькі 15 працэнтаў (каля 200 тысяч рублёў) ад рэальнага кошту.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*А па руках!*

# ЗАКУРЫЦЬ НЕ БУДЗЕ? НЕ!

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя выступіла з заклікам да ўрадаў краін абмежаваць для прагляду фільмы з дэманстрацыяй сцэн ужывання тытуню, каб абараніць ад курэння падрастаючае пакаленне.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Аўтары новага даклада «Фільмы без тытунёвага дыму: ад фактычных дадзеных да дзеянняў» сцвярджаюць, што кінастужкі, якія ўтрымліваюць сцэны ўжывання тытунёвых вырабаў, заахвоцілі мільёны маладых людзей ва ўсім свеце пачаць курыць.

— Ва ўмовах узмацнення абмежаванняў на рэкламу тытунёвых вырабаў фільмы застаюцца адным з апошніх каналаў уздзеяння на мільёны падлеткаў, — кажа дырэктар Дэпартамента СААЗ па прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў Дуглас Бэтчэр.

Даследаванні, праведзеныя ў Злучаных Штатах Амерыкі, сведчаць, што 37% падлеткаў, якія ўпершыню ўзялі ў руку цыгарэту, зрабілі гэта пад уздзеяннем сцэн курэння на экране. Паводле ацэнак Цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў ЗША, толькі ў гэтай краіне сцэны курэння, паказаныя на экране ў 2014 годзе, маглі спрыяць развіццю прыхільнасці да шкоднай звычкі больш чым у шасці мільёнаў амерыканскіх дзяцей, з якіх два мільёны могуць у будучыні памерці ад хвароб, выкліканых ужываннем тытуню.

У 2014 годзе сцэны курэння былі выяўлены ў 44% усіх галівудскіх фільмаў і ў 36% фільмаў, дазволеных для прагляду маладымі людзьмі. Амаль дзве трэціны (59%) найбольш касавых фільмаў, знятых у перыяд з 2002 па 2014 год, утрымлівалі сцэны ўжывання тытуню. Галоўны санітарны ўрач ЗША заявіў, што аднясенне фільмаў, дзе дэманструюцца сцэны курэння, у катэгорыю «для дарослых» дазволіць знізіць паказчыкі распаўсюджанасці курэння сярод маладых людзей у краіне амаль на 20% і прадухіліць адзін мільён смяротных выпадкаў, звязаных з ужываннем тытуню, сярод сённяшніх дзяцей і падлеткаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




У ліку найлепшых

# ШКОЛА ЖЫЦЦЯ ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

## І нават для дзяўчат

**Узнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на найлепшы маладзёжны атрад аховы правапарадку прайшло ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

— Крытэрыяў адбору было шмат. Тут і колькасць выхадаў на дзяжурствы, і колькасць спыненых правапарушэнняў. Прычым усе гэтыя звесткі павінны былі пацвярджацца дакументамі, заверанымі тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, — расказаў **сакратар ЦК БРСМ, камандзір Рэспубліканскага штаба маладзёжных атрадаў аховы правапарадку Дзмітрый ВАРАНЮК.**

Сёння ў маладзёжных атрадах аховы правапарадку налічваецца больш як 15 тысяч байцоў, прычым сярод іх нямала і дзяўчат. Так, зусім нядаўна ў Віцебскай вобласці былі створаны два жаночыя маладзёжныя атрады — на базе Полацкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа і каледжа пры Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава. Пасля папярэдняй падрыхтоўкі дзяўчаты будуць несці дзяжурствы сумесна з полацкімі супрацоўнікамі ДАІ, а ў свае першыя рэйды дружынніцы адправяцца ў канцы лютага.

Усяго за мінулы год байцы МААП больш як 9,3 тысячы разоў выходзілі на дзяжурствы і спынілі 1,3 тысячы правапарушэнняў.

Па словах Дзмітрыя Варанюка, у маладых людзей часта цікавяцца, што ім дае ўдзел у атрадах.

— Мы расшыфроўваем МААП як Мужнасць, Адказнасць, Айчына, Патрыятызм, — тлумачыць ён. — І нават калі маладыя людзі надалей не звяжуць свой лёс з праваахоўнымі структурамі, атрыманыя веды і навыкі не будуць лішнімі ў жыцці. У складанай сітуацыі на вуліцы ці ў грамадскім транспарце яны заўсёды змогуць прыйсці на дапамогу, спыніць канфлікт, паколькі ведаюць, як трэба правільна сябе паводзіць. Выхаваць у сабе стрыжань, стаць сапраўдным мужчынам — вось што, напэўна, важна для маладых людзей.


Нагрудным знакам «За адзнаку ў ахове правапарадку» былі ўдастоены 12 прадстаўнікоў руху МААП.

— МААП — гэта не проста праца па ахове правапарадку, а перш за ўсё самаразвіццё, — падкрэслівае камандзір атрада Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Канстанцін Лойчыц. — Вытрымка, цярплівасць, уменне карэктна кантактаваць з рознымі людзьмі — усе гэтыя якасці ўдзельнікі нашай добраахвотнай дружыны набылі не адразу. Акрамя таго, мы ўдасканальваем свае веды ў галіне права, займаемся фізпадрыхтоўкай, у прыватнасці, наведваем трэніроўкі па рукапашным баі.

По выніках рэспубліканскага конкурсу найлепшым маладзёжным атрадам аховы правапарадку быў прызнаны атрад Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. Другое месца — у атрада Полацкага дзяржаўнага ляснога каледжа. Трэцяе — у маладзёжнага атрада Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа.


Фота Валерыя АКСАКАВАЙ.
Найлепшым маладзёжным атрадам аховы правапарадку прызнаны атрад Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

Сярод камандзіраў атрадаў першае месца заваяваў Андрэй Атрахімёнак, камандзір МААП, створанага пры Ленінскім раённым камітэце БРСМ сталіцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Ідэі маладых

# ГЭТА РЭАЛЬНА ПРАЦУЕ!

## У СТАЛІЦЫ ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ МАЛАДЗЁЖНАГА КОНКУРСУ

**Днямі ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» прайшло «Шоу тэхналогій» — менавіта ў такім фармаце адбываўся фінал самага маштабнага ў краіне праекта па прасоўванні маладзёжных інавацый «100 ідэй для Беларусі». На працягу цэлага дня мінчане маглі бачыць найлепшыя з прыдумак моладзі за мінулы год і, вядома, размаўляць з іх аўтарамі.**

Пачаткоўцы вучоныя, вынаходнікі і бізнесмены прадстаўлялі свае ідэі ў дзесяці кірунках: прамысловасці і будаўнічых тэхналогіях, біятэхналогіях, аграпрамысловым комплексе, медыцыне, энергазахаванні, рацыянальным прыродакарыстанні, нацыянальнай бяспецы і робататэхніцы, інфармацыйных і авіякасмічных тэхналогіях, сацыяльнай сферы, мабільных тэхналогіях. Усяго на фінал прыехалі стваральнікі больш як 100 праектаў — пераможцы раённых і абласных этапаў. Дарэчы, усяго за год на конкурс даслалі больш за дзве тысячы інавацыйных ідэй.

— З года ў год конкурс прыцягвае ўсё больш і больш нераўнадушных людзей, — зазначыў на адкрыцці выставы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ.** — Ён дазваляе моладзі рэалізоўваць свае задумы і, што важна, рабіць гэта на карысць сваёй дзяржаве. Высокі ўзровень праектаў, прадстаўленых сёння на выставе, — самы яскравы паказчык таго, што Беларусь нездарма падтрымлівае маладых вучоных. Адзначыў бы, што большасць ідэй скіравана на прымяненне ў рэальным сектары эканомікі, яны ўжо сёння могуць прыносіць прыбытак нашай краіне.

Распавёў Ігар Бузоўскі і пра конкурс «100 ідэй для СНД», які мае адбыцца сёлета. У свой час ідэю аб пераходзе беларускага конкурсу на міжнародны ўзровень агучылі на Савеце па справах моладзі краін Садружнасці. Галоўная задача цяпер, па словах намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, у вывядзенні ідэі на арганізацыйны ўзровень. У прыватнасці, зараз вырашаюцца фінансавыя пытанні.



Праект музея рэтра-тэхнікі ад студэнтаў БДУІР прыцягваў увагу не толькі моцнай паловы публікі.

— Безумоўна, сённяшні фінал асаблівы, бо мінулы год у нашай краіне праводзіўся як Год моладзі, — гаворыць **каардынатар «100 ідэй для Беларусі», старшыня ЦКК БРСМ Алеся ВІННІК.** — Ізноў на конкурс прыйшло вельмі шмат унікальных праектаў: квадракоптараў, беспілотных лятальных апаратаў, цікавых задум у сферы хіміі, харчовай прамысловасці. Упершыню з'явілася намінацыя «Нацыянальная бяспека і абараназдольнасць», і мы ўбачылі, што моладзі гэта цікава.

Прэзентацыя праектаў праходзіла ў фармаце «стартапаў»: аўтары прадстаўлялі распрацоўкі, паказвалі бізнес-планы... У ролі ацэншчыкаў выступала журы, складзенае з прадстаўнікоў самых розных кампаній і дзяржведамстваў, а таксама пераможцаў конкурсу мінулых гадоў. Экспертны Савет вызначаў дзесяць найлепшых праектаў, якія і сталі пераможцамі «100 ідэй для Беларусі — 2015».


Рэчы з арнаментам на вачах у гледачоў рабіў спецыяльны робат.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Сваім удзелам у конкурсе мы хочам звярнуць увагу на праблему экалогіі ў нашай краіне, — распавёў **студэнт IV курса Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, стваральнік праекта «Фандамат» Аляксандр БАКАЧОЎ.** — Наша распрацоўка ўяўляе аўтамат па прыёме выкарыстаных пластыкавых бутэлек і бляшанак. Ён счытвае з іх штрыхкоды, і чалавек можа або тут жа атрымаць дробныя наяўныя грошы, або накіраваць сродкі на дабрачыннасць. У конкурсе «100 ідэй для Беларусі» мы бачым магчымасць для прасоўвання праекта на больш высокі ўзровень. Было б здорава, каб наш аўтамат з'явіўся ва ўсіх буйных гарадах. І, дарэчы, ужо маем прапановы аб супрацоўніцтве ад некаторых дзяржструктур і кампаній.

Падчас урачыстага ўзнагароджання пераможцы конкурсу атрымалі ў якасці бонусу пуцёўкі на Міжнародны маладзёжны конкурс «100 ідэй для СНД»; гранты ў памеры 40 тарыфных ставак ад Беларускага інавацыйнага фонду, а таксама сучасныя гаджэты ад кампаніі «Huawei». Так, напрыклад, у намінацыі «Прамысловыя і будаўнічыя тэхналогіі і вытворчасць» найлепшымі сталі праекты «Комплекс па ўратаванні тапельцаў» Антона Любахінца і «Унікальны спосаб штампоўкі ключавых дэталяў калайдара» Аліны Марышавай. У «Сацыяльнай сферы» перамог праект «Школа юных шапавалаў» Алены Віхровай.

Гран-пры і сертыфікат у памеры 120 мільёнаў беларускіх рублёў — спецыяльны прыз ад кампаніі «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь» — дастаўся аўтарскаму калектыву праекта «Кавітацыйны вадапенны насадак пажарнага ствала» (Камандна-інжынернага інстытута МНС) у складзе Андрэя Камлюка, Чан Дык Хаана і Аляксандра Грачуліна.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# ПАМІЖ СЭРЦАЙКАМ І ЗОРАЧКАЙ

**Інтэрнэт — люстэрка нашага жыцця. Людзі праз сеціва знаёмяцца і нават жэняцца. Як і ў рэальным свеце, карыстальнікі размяркоўваюцца па інтарэсах на спецыялізаваных форумах, вучацца на дыстанцыйных курсах, чытаюць, глядзяць, слухаюць... І, нарэшце, пратэстуюць, калі ім нешта не падабаецца.**

Некалькі гадоў таму расійская сацыяльная сетка «УКантакце» праводзіла маштабны рэдызайн. Адным з самых важных крокаў была замена так званай «сцяны» на больш сучасны мікраблог. Новаўвядзенне не надта спадабалася карыстальнікам рэсурсу. Сотні тысяч незадаволеных распачалі акцыю пад назвай «Дураў, вярні сцяну!» (маючы на ўвазе стваральніка і былога гендырэктара сацыяльнай сеткі) і нават абяцалі правесці своеасаблівы «страйк» — цэлы дзень не карыстацца «УКантакце» ў знак пратэсту. Адміністрацыя рэсурсу на масавы пратэст ніяк не адрэагавала. У хуткім часе акцыя пайшла на спад. Сёння ўсе настолькі звykліся з мікраблогам, што мала хто памятае, як раней была рэалізавана функцыя посцінгу.

Ці вось зусім свежая гісторыя інтэрнэт-змагання. Адміністрацыя адной з самых папулярных у свеце сацыяльных сетак Twitter вырашыла пайсці на «кардынальныя» змены — замест аформленай як зорачка кнопкі «Выбранае», якой карыстальнікі могуць пазначаць упадабаныя твіты, увяла больш распаўсюджанае ў інтэрнэце «Мне падабаецца» ў выглядзе сэрцайка. Хваля абурэння мільёнаў «старавераў» ад інтэрнэту літаральна накрыла стужкі карыстальнікаў.

Зусім нядаўна ўсё той жа Twitter рэалізаваў яшчэ адну змену, праўда, ужо больш сур'ёзную. Замест ранейшай сарціроўкі паведамленняў у стужцы па часе (больш новыя твіты заўсёды знаходзяцца ўверсе) запрацавала так званая алгарытмічная сістэма — сацыяльная сетка аналізуе, якія з іх могуць быць цікавымі карыстальніку, і змяшчае лепшыя ўверсе стужкі. Падобнай сістэмай карыстаецца гігант Facebook. Думаю, не трэба казаць, як адрэагавалі юзеры? Праўда, новую функцыю пакуль што дазваляюць адключаць у настройках.

Ёсць, зрэшты, і прыклады больш паспяховых «страйкаў». Прызначаны для аматараў кінамастацтва сайт «Кінапошук» набыў расійскі інтэрнэт-гігант «Яндэкс». Першым жа крокам па ўдасканаленні працы рэсурсу стаў рэдызайн — каб прывесці сістэму да адзінай канцэпцыі з іншымі сэрвісамі кампаніі. Разам са зменамі ў знешнім выглядзе сайт страціў частку сваіх функцый, што, вядома, раз'юшыла шматгадовых карыстальнікаў «Кінапошуку». Адміністрацыі хапіла літаральна сутак, каб прызнаць свае памылкі. Стары варыянт адразу ж вярнулі, а новы перамясцілі на іншы адрас і пачалі дапрацоўку з улікам меркаванняў кінааматараў.

І ў чым, спытаеце вы, праблема? Людзі ўвогуле часта не вельмі прыхільна ставяцца да новага, а тут змяняецца тое, што закранае амаль кожнага. Але мне, шчыра кажучы, здаецца, што калі перанакіраваць намаганні байцоў лічбавага фронту на рэальнае жыццё, можна змяніць свет да лепшага.

Скажам, праект мінскай міліцыі пад назвай «#перахват» існуе ў інтэрнэце ўжо колькі гадоў. Дзякуючы яму кожны можа спыняць супрацьпраўныя дзеянні пры дапамозе свайго смартфона. Убачыў хамскую паркоўку побач з уласным домам? Сфатаграфуй і дашлі міліцыянерам — яны разбяруцца. Натоўп падлеткаў пасярод ночы гучна гуляе пад вокнамі? Тая самая парада.

Сёлета падобным рэсурсам узаемадзеяння з грамадскасцю абзавяліся і сталічныя камунальнікі. Партал 115.бел пад назвай «Мой горад» стаў для мінчан незаменным спосабам хуткай і дзейснай камунікацыі з работнікам сферы ЖКГ. Непрыбраныя двары, нявывезенае смецце, выбоіны на дарогах і тратуарах, неспілаваныя дрэвы і многае іншае — ужо амаль чатыры тысячы розных па маштабе праблем вырашылі дзякуючы актыўнасці грамадзян і неабыякавасці дзяржслужбаў.

Пакуль адны пратэстуюць у інтэрнэце, іншыя змяняюць рэчаіснасць: прасоўваюць свае ідэі, рэалізуюць праекты. І мне здаецца, няважна, якую кнопку пры гэтым націскаць: у форме сэрцайка ці зорачкі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Мова і танца*

# БЫЦЬ ШЧЫРЫМ У КОЖНЫМ РУХУ

**Апантанага сваёй справай чалавека заўжды выдаюць агонь у вачах і нейкі незвычайны азарт. Асабліва калі гаворка ідзе пра такі пачуццёва, эмацыянальна адкрыты від творчасці, як танец: трэба быць шчырым да апошняга руху, каб глядач табе паверыў, злавіў твой пасыл.**

**Менавіта так выкладае малады харэограф Уздзенскай дзіцячай школы мастацтваў Раман ТРУШКО. Хлопец скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут культуры і шукаў месца працы, а дырэктар Дзмітрый Кантаровіч — харэографа. І, на шчасце, іх шляхі перакрыжаваліся. Маладога педагога пад сваё крыло ўзяла Наталля Бацішчава, якая дапамагае спецыялісту ўліцца ў прафесію, зрабіць першыя самастойныя крокі.**

***— Раман, чаму выбралі гэтую прафесію?***

— Мне проста падабаецца танцаваць, падабаецца адкрываць у сабе новыя эмоцыі, пачуцці праз танец. Калі я вучыўся ў школе, то нават не планаваў стаць харэографам. Пасля заканчэння пайшоў... у кулінарны каледж у Гомелі. Так што па першай адукацыі я кухар. Па спецыяльнасці, праўда, працаваў зусім мала. Адчуў, што гэта не маё, і паступіў на спецыяльнасць «харэограф эстрады» ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

***— Як вам працуецца з дзецьмі?***

— Работа з імі не можа быць нецікавай. Прыемна назіраць, як яны стараюцца, працуюць не толькі для адзнакі, але і для задавальнення. Да мяне на занняткі прыходзяць розныя дзеці, і прыемна, што ёсць такія, з якімі хочацца працаваць сур'ёзна. Часцей за ўсё звяртаюцца з просьбай навучыць сучасным танцам — гэты кірунак ім бліжэй. Я адразу папярэджваю, што ўсё не так проста.

Раман прапаноўвае нейкую аснову, а дзеці часта робяць уласную транскрыпцыю рухаў. І гэта таксама добра, бо ў такім выпадку яны хутчэй авалодваюць танцам у цэлым. А нейкія няроўнасці і памылкі потым ужо лёгка шліфуюцца. Для дзяцей Раман Эдуардавіч імкнецца быць сябрам, знаходзіцца з імі на адной хвалі.

— Мне самому цікава спасцігаць розныя стылі, змешваць іх, — гаворыць суразмоўца.

Прафесійная падрыхтоўка дала магчымасць давесдацца пра азы класічнага, народнага і эстраднага танца, таму хлопец актыўна цікавіцца дзейнасцю знакамітых харэографаў. Сярод іх Брайн Фрыдман, Яніс Маршал, Мігель Заратэ. Гэтыя людзі рыхтавалі творчыя нумары вядучых зорак сусветнай эстрады, якія вядомыя ў многіх краінах.

— Я больш стаў разумець нейкія дробныя дэталі, нюансы харэаграфіі, — расказвае хлопец. — Усё, пра што даведваюся, адразу ж перадаю дзецям: ёсць нейкія віды размінак, цікавыя практыкаванні, якія проста карысныя для развіцця цела.

Пэўны час Раман Трушко быў удзельнікам танцавальнага праекта Беларусі «Trend Deluxe», пераможцы нацыянальнага адборачнага тура Беларусі «Еўрабачанне-2013», увайшоў у топ-100 лепшых танцораў СНД тэлепраекта «Танцуюць усе».

Маладому харэографу падабаецца працаваць ва Уздзе. Тут выдатная зала для рэпетыцый, шчырыя дзеці, а галоўнае — дружалюбны калектыў.

**Дар'я ЗЯНЬКОВІЧ.**



Раман Трушко з выхаванцамі.

# ГЛАЗУРА ДЛЯ «БІСКВІТУ»...





Ігар Нікалаеў: «Вось гэта — зборны вобраз самых розных дзяўчат».

Фота Надзеі БУЖАН.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

На новым месцы Ігару спачатку даверылі працу з дэколямі — спецыяльнымі «налепкамі» для фарфору. Калі звычайна малюнак на вырабы наносіцца ўручную, то гэты метад дазваляе перанесці на посуд тысячы аднолькавых узораў. Малады спецыяліст займаўся стварэннем новых дэколяў на камп'ютары. Іх дасылалі на іншы завод, дзе малюнкі друкавалі, а пасля ляпілі на посуд. Пасля абпальвання фарфоравых вырабаў такі малюнак «прасочваецца» пад глазуру і робіцца трывалым. Гэтая работа атрымлівалася ў хлопца няблага, і таму вельмі хутка яго перавялі працаваць з «формай», у прыватнасці, са скульптурай. Галоўнай задачай цэпер было стварэнне аб'ёмных вырабаў з фарфору і іх роспіс.

— Спачатку я распрацоўваю праект, — распавядае Ігар. — Малюю эскіз таго, што хачу бачыць у выніку. Пасля выконваю скульптуру ў аб'ёме з пластыліну. Праца не такая простая, бо ў фарфору шмат уласцівасцяў, і не кожная фігура з яго атрымаецца. Займае працэс прыкладна месяц. Гатовы макет адношу ў мадэльны цэх, дзе для яго робяць гіпсавую форму. Ліцейшчык залівае ў форму вадкі фарфор — шлікер, пасля чаго фігуру абпальваюць у печы. Атрымліваецца неглазураваны фарфор — бісквіт. Потым фігура звычайна зноў трапляе да мяне — на роспіс. Але калі малюнак нескладаны, яго могуць наносіць і звычайныя рабочыя, якія добра валодаюць тэхнікай мазка.

**«Пра фарфор у мяне ніякага ўяўлення не было, бо спецыяльнасць — выключна мастацкая. Але кіраўніцтва вырашыла паспрабаваць навучыць мяне ўсяму, што трэба».**

Хлопец дэманструе некаторыя са сваіх твораў: дэбютных малпачак (статуэткі ствараліся ў якасці сімвалаў года), дзяўчыну-кветачніцу, іншыя работы... Акрамя гэтага, ён распісаў незлічоную колькасць чайных сервізаў.

Пытаемся, што натхняе маладога скульптара, адкуль бяруцца задумы яго твораў. «Вось гэта, — паказвае Ігар на сваю кветачніцу, — зборны вобраз самых розных дзяўчат». Яшчэ адзін шлях для натхнення — творы іншых мастакоў. Хлопец кажа, што яму імпануюць рускія класікі: Васняцоў, Крамскі... З заходнееўрапейскіх мастакоў — Іеранім Босх.

Усяго на заводзе працуюць чатыры мастакі-скульптары, але сябры ў Ігара ёсць і ў іншых цэхах. Моладзі на заводзе хапае... А вось месцаў для адпачынку ў горадзе не так шмат. Праўда, зусім недалёка Гомель, да якога прыкладна паўгадзіны язды. Але большасць вольнага часу мастак займаецца ўсё той жа творчасцю — піша карціны алеем, у асноўным на гістарычную тэматыку: Кулікоўская бітва, старажытная Русь...

На пытанне аб заробку Ігар усміхаецца: «Мяне ўсё задавальняе». З жыллём праблем няма — у бабулінай кватэры ён жыве разам з бацькамі.

— Творчая праца падабаецца, — канстатуе Ігар. — Гэта тое, чаго я хацеў. Мне цікава, як тое, што ў мяне ў галаве, пераўтвараецца ў гатовую прыгожую рэч. Ёсць, вядома, і складанасці: як прыдумаць, як рэалізаваць задуму... Хоць гэта дробязь у параўнанні з задавальненнем, якое мне прыносіць работа. Хацеў бы застацца тут надоўга, пакуль ні пра якія перамены ў жыцці не думаю.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск—Добруш—Мінск.*

*Знайсці сябе*

# ПЕРШЫ АЎТАРЫТЭТ У КЛАСЕ,

## ці Чаго баіцца малады настаўнік



**Летась 3 «В» Глыбоцкай сярэдняй школы №1 імя П.В. Сухога знаёміўся з новай «класнай мамай». Ёй стала Наталля ВЫШАТКА, выпускніца педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, а цяпер — самы аўтарытэтны чалавек у сваім класе.**

***— Чым вас найперш здзіўляюць вучні?***

— У пачатковай школе яны яшчэ не ўмеюць падманваць. Калі спрабуюць гаварыць няпраўду, гэта настолькі добра бачна, што нават хочацца ўсміхнуцца. Яшчэ заўважыла, што маленькія школьнікі часта з-за дробязяў скардзяцца адзін на аднаго. Трэба разбірацца, бо пакуль што слова настаўніка — апошні аргумент у любой спрэчцы.

***— Ці моцна адрозніваецца педагагічная праца ад студэнцкіх уяўленняў пра яе?***

— Калі я толькі прыйшла з універсітэта ў школу, то марыла, што ў мяне ўсё лёгка атрымаецца. Думала, дзеці будуць больш паслухмяныя, будуць разумець усё з першага тлумачэння (бо я ж пастараюся добра тлумачыць). І ўсё будзе супер. Але мары з рэальнасцю некалькі разышліся. З'явіліся паперы, якія трэба запаўняць, прычым як з некаторымі працаваць — ва ўніверсітэце не расказвалі. Напрыклад, далі дзённік класнага кіраўніка — і ўсё, трэба ісці да іншых настаўнікаў, прасіць, каб дапамаглі. Але адносіны калег па настаўніцкай былі добрыя! Падалося, што больш сталыя настаўніцы ўспрынялі мяне як дачку. Да іх можна было падысці, параіцца наконт каляндарнага часу ці самастойных работ. Памятаю, напярэдадні адкрытага ўрока па матэматыцы вельмі хвалявалася, дык завуч мяне супакоіла: «Не хвалюйся, Наташа». Дастала свае папкі, прапанавала паглядзець, як праводзіць такія ўрокі мінулыя разы, падтрымала мяне.

***— Якія вашы асноўныя правілы пры стасунках з вучнямі?***

— Выпрацоўваю ў сабе цярплівасць. Гэта важна: гаварыць, не павышаючы голасу, некалькі разоў растлумачваць адзін і той жа момант у тэме і не раздражняцца. Такога правіла прытрымліваюся сама і гэтаму ж хачу навучыць дзяцей: каб яны не сварыліся з-за дробязяў, не перабівалі адзін аднаго. Хачу навучыць узаемапавазе.

***— Як спраўляецеся з гарэзнікамі?***

— Іх звычайна супакойваюць аднакласнікі. Дзеці многае бачаць і многае адчуваюць. Напрыклад, калі настаўніца стамілася ці ў яе разбалелася галава, клас гэта разумее і спакайнее.

***— Вучні баяцца дрэнных адзнак, строгіх настаўнікаў... А чаго баіцца настаўнік?***

— Бацькоў. Ведаеце, дзеці розныя, з рознымі здольнасцямі і характарамі. Некаторыя бацькі гэта разумеюць, а некаторыя патрабуюць ад настаўніка добрых адзнак...

***— Выбраць прафесію параілі родныя?***

— Сярод сваякоў настаўнікам быў толькі дзядзька, ды і тое ён мала працаваў па спецыяльнасці. Я, наогул, хацела спачатку паступіць на юрыдычны факультэт, як мая сястра, рыхтавалася, чытала кодэксы. А потым неяк у школе быў дзень самакіравання, сяброўкі прапанавалі правесці ўрокі ў пачатковай школе. А там маленькія дзеткі, яны ж цікаўныя, у іх вочкі блішчаць! Настолькі спадабалася быць настаўніцай, што прыйшла дадому і сказала маці, што ўсё вырашана — пайду ў педагагічны. Вось так, у адзінаццатым класе змяніла свой выбар.

***— У вас ёсць якія-небудзь захапленні? Як бавіце свабодны час?***

— Падабаецца рабіць паштоўкі ўручную з паперы. І запрашэнні на вяселле. Раптам захачу выйсці замуж, а тут ужо гатовыя запрашэнні ёсць *(смяецца)*. Раней любіла яшчэ рабіць кветкі з паперы, але пасля таго, як давялося рыхтаваць да школьных свят больш за сотню такіх кветачак, я да гэтага занятку згубіла цікавасць.

***— Ці параілі б выпускнікам паступаць на педагагічныя спецыяльнасці?***

— Я прапанавала б ім найперш падумаць, ці сапраўды яны хочуць ісці ў гэту прафесію. Калі адзіная мэта — занесці дакументы ў педагагічны ўніверсітэт і праз некалькі гадоў атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, то лепш не трэба гэтага рабіць. Без цікаўнасці да таго, што робіш, праца не прынясе задавальнення ні настаўніку, ні яго падапечным.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Жывая памяць*

# У ГОСЦІ ДА НАРОДНАГА ПАЭТА

## Як у сталічнай школе зберагаюць спадчыну Пімена Панчанкі

**— Вы зойдзеце ў наш музей і самі адчуеце: у ім — як у храме, — гаворыць дырэктар 199-й мінскай школы Галіна ФІЛІПЁНАК.**
**І насамрэч, тут вельмі светла і ўтульна, душэўнасці і цеплыні гэтаму школьнаму музею народнага паэта Пімена Панчанкі дакладна хапае. Можа быць, таму, што яго ствараюць людзі, якім творчасць і лёс Пімена Емяльянавіча сапраўды блізкія.**


Фота Канстанціна ДРОБАВА.
Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Таццяна КУРАШЭВІЧ, член савета музея, дэманструе яго экспанаты.

### Здзіўляюцца нават сваякі

Напэўна, так сышліся зоркі: сярэдняя школа №199, у якой размяшчаецца літаратурны музей паэта, знаходзіцца ў Мінску на вуліцы, названай у яго гонар. У 2003 годзе па ініцыятыве настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Яніны Іванаўны Плашчынскай і першага дырэктара школы Сяргея Пятровіча Стрэнкоўскага тут адкрылася экспазіцыя, прысвечаная Панчанку. Значную дапамогу ў яе стварэнні аказала жонка паэта Зоя Кірылаўна, якая перадала ў школу многія рэчы мужа.

Цяпер фонды ўнікальнага музея налічваюць 1003 прадметы. Чаму ўнікальнага? Таму што гэта адзіны не толькі ў Мінску, але і ў Беларусі літаратурны музей, прысвечаны жыццю і творчасці Пімена Емяльянавіча. Тут прадстаўлены рэчы, якія перадалі яго сваякі.

— Вельмі прыемна, што яны даверылі нам сваю спадчыну. Калі сваякі наведваюць музей, здзіўляюцца, што мы расказваем пра іх жыццё і ведаем пра некаторыя падзеі нават больш, чым яны самі, — усміхаецца Галіна Аркадзьеўна.

Ды і для саміх школьнікаў Пімен Панчанка — не проста прозвішча з падручніка па літаратуры, а выбітная асоба, да захавання памяці якой яны маюць самае непасрэднае дачыненне. У музеі вучні старэйшых класаў праводзяць экскурсіі, а таксама прымаюць удзел у навуковай і пошукавай рабоце.

— Яе праводзіць не так лёгка, бо некаторыя рэчы паэта сям'я нам ужо перадала, і цяпер яны з'яўляюцца хіба што з нейкай нагоды. Напрыклад, да 95-годдзя паэта яго блізкія прыйшлі ў музей не з пустымі рукамі: прынеслі друкавальную машынку, якая належала Пімену Панчанку. Хоць друкавала, у асноўным, Зоя Кірылаўна, але ж і рукі паэта да яе таксама дакраналіся, — расказвае дырэктар.

А калі ў рэдакцыі часопіса «Роднае слова» праходзіў рамонт, адтуль у школу перадалі шафу, якая калісьці стаяла ў кватэры Пімена Емяльянавіча.


Асабістыя рэчы паэта.

### Нос рыбы-пілы і званочак

Экспазіцыя змяшчае сем тэматычных раздзелаў, кожны з якіх паказвае асобу Панчанкі праз сямейныя і сяброўскія адносіны, падзеі ваеннага часу, вандроўкі — а ён вельмі шмат ездзіў па свеце. У музеі сабрана амаль уся асабістая бібліятэка Панчанкі — любімыя кнігі, творы сяброў-пісьменнікаў з аўтографамі і, безумоўна, выданні самога народнага паэта. Тут можна ўбачыць не толькі экспанаты з цікавым лёсам, але і насамрэч экзатычныя — такія, як, напрыклад, нос рыбы-пілы — яго Пімен Емяльянавіч прывёз з Непала.

Яшчэ адна цікавая рэч — званочак з Валдая, выраблены па тэхналогіі 1225 года. Яго падарылі беларускаму паэту, які быў ганаровым жыхаром горада. Гэты прадмет не проста стаіць на стале ў музеі, а гучыць для школьнікаў на першай і апошняй лінейках у навучальным годзе.

А піянерскі гальштук з Бухары, які захоўваецца ў музеі, натхніў паэта на верш. Гэты гальштук пад вялікім уражаннем ад сустрэчы з Піменам Панчанкам перадала паэту ўзбекская дзяўчынка.

Кубачак, з якога паэт піў гарбату, стол з незацёртым кружочкам ад яго, тканыя гальштукі з арнаментам, ключыкі ад чамаданаў, куфэрак для лекаў, фотаапарат, электрабрытва — усе гэтыя рэчы надаюць музею асаблівую цеплыню, а самога народнага паэта ў вачах наведвальнікаў робяць простым і дамашнім — сваім.

### На бацькоўскі сход — у музей!

У музеі фактычна няма сучасных матэрыялаў, і менавіта гэта надае яму ўтульнасці і дапамагае захаваць дух часу, у якім жыў паэт. Нават рэчы на стале размешчаны ў тым жа парадку, у якім раскладаў іх Панчанка.

— У Пімена Емяльянавіча ёсць верш «Жыта». Ён вельмі любіў жытнёвае поле. І ў вершы ёсць такія словы: «калі не пабачу жыта, раблюся хворым». Таму ў музеі заўсёды стаіць вялікі сноп жыта.

Сама Галіна Філіпёнак працуе ў 199-й школе шэсць гадоў, і за гэты час па-сапраўднаму праніклася творчасцю Пімена Панчанкі. Яна расказвае пра музей, яго экспанаты, сваякоў і самога паэта, як пра нешта сакральнае.

— Калі бачыш апантанасць настаўнікаў і вучняў, кіраўніку застаецца абыякавым немагчыма, — тлумачыць яна.

Па ініцыятыве Галіны Аркадзьеўны да 95-годдзя Панчанкі, якое адзначалі ў 2012 годзе, у музеі правялі рамонт: замянілі падлогу, затаніравалі шкло, каб дзённае святло не псавала экспанаты. Стварылі асобны пакой для музейнай дакументацыі і фондаў. На гэта пайшлі сродкі, якія зарабіла школа, дапамагалі і бацькі вучняў. Дарэчы, для іх хаця б раз на год бацькоўскі сход пачынаецца з экскурсіі.

Ужо цяпер у школе рыхтуюцца адзначыць 100-гадовы юбілей паэта, хоць да яго яшчэ больш за год. Да гэтай даты плануюць вынесці экспазіцыю за межы аднаго памяшкання. А яшчэ ідзе праца над тым, каб музей атрымаў званне народнага. За апошнія тры гады яго наведалі больш за 4,2 тысячы чалавек. Паглядзець экспанаты можа любы ахвотны, для гэтага трэба патэлефанаваць у прыёмную і пакінуць заяўку.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

## З пошты Чырвонкі

### Нас аб'яднала «Савяня»

**Вольга ПРАНКЕВІЧ,**
**вучаніца 11 класа СШ №4 г. Навагрудка:**

**«Клуб «Савяня» ў нашай школе працуе з 2010 года, яго наведваюць вучні 5-11 класаў. Папулярнасць інтэлектуальнага руху сярод іх расце з года ў год.**

Свая каманда ёсць амаль у кожнай паралелі: «99 рэвалюцый», «Трынітрагліцэрын» (юніёры), «Пазітыў», «Шчаслівчыкі» і іншыя. Члены клуба ўдзельнічаюць не толькі ў школьных турнірах, але і ў гульнях раённага і абласнога ўзроўняў. Каманды нашай школы неаднаразова змагаліся за кубак у сінхронным чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па гульні «Што? Дзе? Калі?» сярод каманд клуба «Навагрудскія волаты» на пляцоўцы Навагрудка.

Як кажа кіраўнік клуба Людміла Андрэеўна Бузук, кожны, хто прыходзіць у яго, набывае новых сяброў, магчымасць цікава і з карысцю правесці свой вольны час. «І чым больш дзяцей уступае ў рады «знаўцаў», тым вышэйшы інтэлектуальны патэнцыял нацыі — адзінае багацце краіны, якое нельга набыць за грошы. І дзе б потым ні апынуліся інтэлектуалы, уменне думаць спатрэбіцца ім у любой сітуацыі».

### Знайсці сваё прызванне

**Святлана ЧЫЖЫК,**
**студэнтка ІІ курса Інстытута журналістыкі БДУ:**

**«Надзея Аляксандраўна Андроцкая ўсё сваё свядомае жыццё прысвяціла дзіцячаму здароўю: ужо 35 гадоў працуе ў цэнтральнай раённай бальніцы Беразіно дзіцячым урачом і адначасова загадчыкам дзіцячага аддзялення паліклінікі.**

Бацькі хлопчыкаў і дзяўчынак, якіх яна лечыць, сцвярджаюць, што менавіта яе трэба лічыць Урачом з вялікай літары. Сама ж жанчына кажа, што ўрач, асабліва педыятр, павінен быць добрым, умець знаходзіць кантакт з дзецьмі.

— Яны адчуваюць дабрыню і падмануць іх проста немагчыма. Нельга і перадаць, як прыемна чуць ад маленькага хворага: «Да пабачэння, я цябе люблю!» Калі маці бачыць добрае стаўленне да яе дзіцяці, то і ёй прыемна, — кажа Надзея Аляксандраўна. — Да нас аднойчы ў аддзяленне прыйшла дзяўчына, якая прызналася, што не любіць дзяцей. Але пры гэтым яна скончыла педыятрычны факультэт медуніверсітэта з «чырвоным дыпломам». Таму я думаю, што трэба адразу вызначыцца, чым вы хочаце займацца ў жыцці, у якой прафесіі вы сябе бачыце. Кожнаму трэба быць на сваім месцы. Галоўнае — паставіць мэту і ісці да яе».

### Вандруйце па краіне!

**Ганна КУРТАСАВА,**
**вучаніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска:**

**«Мне вельмі падабаецца, што школьныя настаўнікі возяць нас на экскурсіі па розных кутках краіны.**

Лічу гэта вельмі правільным, бо такім чынам кожны з нас становіцца бліжэй да сваёй Радзімы і яе культуры. Такія вандроўкі дапамагаюць нам больш зразумець быт і заняткі людзей, якія жылі да нас і стваралі гісторыю.

Я вельмі люблю ездзіць па Беларусі, даведвацца пра нешта новае, невядомае. Мне падабаюцца ўсе мясціны, дзе давялося пабываць, але самы цікавы куток — Белавежская пушча. Гэта месца — сімвал беларускай прыроды, маленькі куточак цішыні, спакою і прыгажосці з яго непаўторнымі жывёламі і старымі магутнымі дрэвамі. Менавіта Белавежская пушча найлепш характарызуе нашу краіну, як багатую на разнастайныя віды флоры і фаўны. Туды варта зазірнуць!

Наша Радзіма вельмі прыгожая і маляўнічая, таму неабходна захоўваць гэтае багацце для наступных пакаленняў, як тое зрабілі для нас прадзеды. Трэба пакінуць пасля сябе новую гісторыю і захаваць старую, каб і нашы дзеці маглі памятаць мінулае і ствараць будучыню».

**Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
ЧЫРВОНКА

### Не засталіся раўнадушнымі

**Усе мы памятаем нядаўнюю гісторыю пра анкалагічна хворага хлопчыка Андрэйку і снегавікоў, калі неабыякавыя людзі замаўлялі гэтую цацку, дапамагаючы сабраць грошы на аперацыю. Да яе далучыліся і вучні, іх бацькі, настаўнікі з віцебскай гімназіі №3.**

— Нельга быць раўнадушнымі да чужой бяды! Нарабілі снегавікоў, усталявалі скрыню для збору сродкаў. Удзел у акцыі бралі навучэнцы з 1 па 11 клас, многія дарослыя. Ужо нават калі снегавікоў не было, адна жанчына проста так прынесла 200 тысяч рублёў, — распавяла педагог-арганізатар навучальнай установы Алена ЛУК'ЯНЕНКА, куратар пярвічкі БРСМ гімназіі. Гэта яна са сваім валанцёрскім атрадам «Добрае сэрца» распачала збор грошай.

Калі сродкі сабралі, прыйшла інфармацыя, што Андрэю яны ўжо не трэба. І тут стала вядома, што ў матэрыяльнай дапамозе мае тэрміновую патрэбу вучань віцебскай СШ №31 Мікіта Нікіцін. І грашовыя сродкі ў суме 1,5 мільёна рублёў былі пералічаны яму для лячэння.

### У адказе за тых, каго прыручылі

**Раз на тыдзень члены арганізацыі БРСМ з правамі раённага камітэта ААТ «Белшына» інжынеры-тэхнолагі Юля КАЛІНОЎСКАЯ і Ганна МАРТЫНОВІЧ наведваюць прытулак для бяздомных сабак «Дабрачыннасць»: дагледзяць хворых жывёл, кормяць іх, наводзяць парадак на месцах утрымання.**

Дзяўчаты дапамагаюць гадаванцам прытулку ўжо каля года. Як расказала Юля, яна стала займацца гэтай справай таму, што вельмі любіць менавіта сабак. На жаль, пакольні дзяўчына пражывае ў інтэрнаце, у яе зараз жывуць толькі два папугаі і рыбкі. Год таму ў прытулку ўтрымлівалася каля 30 жывёл, зараз — каля дзясятка. Юля кажа, што, бывае, шчанюкоў ці дарослых сабак добрыя людзі разбіраюць даволі хутка, але здараецца, што тыя затрымліваюцца на працяглы тэрмін. Вядома, тады ў дзяўчыны з'яўляюцца свае любімчыкі. Хто ведае, можа нейкі з іх некалі пераедзе жыць у новую кватэру Юлі?..

### Падарыць шанц на жыццё

**Максім ГОЛАД з Горак за свае сродкі набыў і раздаў мінакам у неасветленых месцах горада 25 флікераў.**

Малады чалавек — сакратар пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта БРСМ Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. А яшчэ — кіроўца, якому ў цёмны час сутак неаднойчы пад колы ледзьве не кідаліся нічым не абазначаныя пешаходы.

— Пяць тысяч рублёў — зусім невялікія грошы, але той флікер можа выратаваць, напрыклад, жыццё дзіцяці, — кажа хлопец. Дарэчы, гэтую своеасаблівую акцыю ён правёў самастойна, можна сказаць, нават спантанна.

А потым у Максіма ўзнікла ідэя арганізаваць яе на пастаяннай аснове і ў перспектыве аб'яднаць намаганні з ДАІ і аўтаклубам, каб раздаваць флікеры масава. «Можна нават прапанаваць праводзіць такую акцыю на рэспубліканскім узроўні. Па сутнасці яна вельмі простая, а эфект ад яе можа быць значным», упэўнены хлопец.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,

***опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181,*** **строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир, площадью **90,12 кв.м**, на 8 этаже – 1300 (одна тысяча триста) долларов США, площадью **71,87 кв.м**, на 12 этаже – 970 (девятьсот семьдесят) долларов США.»

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.**
**Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 153 33 24, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| № лота | Наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв.м | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Характеристика объекта | Условия аукциона | Размер арендной платы |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право заключения договора аренды части помещения в г. Лида, ул. Чапаева, 20, площадью 3,0 кв.м. Срок договора аренды – 3 года | 90 000 | 9000 | Часть помещения расположено в холле 1-го этажа четырехэтажного кирпичного административного здания 1977 г. постройки. Стены – кирпичные; перегородки – кирпичные; перекрытия – железобетонные | для размещения офисного банкомата и платежно-справочного терминала самообслуживания | 5,0 базовых величин в месяц |

**Аукцион состоится 18 марта 2016 года в 11.00 по адресу: г. Лида, ул. Чапаева, 20, каб. 24.**
**Заявки принимаются ежедневно – с 22 февраля 2016 в рабочие дни с 8 до 12 и с 13 до 17 часов по адресу: г. Лида, ул. Чапаева, 20, каб. 24А.**
**Последний день приема заявок и внесения задатка – «17» марта 2016 года.**
**Заключительная регистрация участников аукциона 18 марта 2016 года с 10 до 11 часов.**

**Организатор аукциона – РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», 230019, г. Гродно, ул. Захарова, 27. Расчетный счет Лидского филиала 3012266160011 в отделении №228 ОАО «Белинвестбанк» г. Лида, код 739, УНП 500173117, ОКПО 03372699.**

*С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 12 и с 13 до 17 часов.*
***Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения или получения дополнительной информации: г. Лида, (0154) 52-21-79, 52-58-55.***

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 401/С-27647 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – многоквартирный жилой дом), площадью 435,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Кошубинцы, 73 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 422088507601000055 (назначение – для обслуживания жилого дома), площадью 0,2500 га, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Кошубинцы. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью – 0,2500 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью – 0,0008 га |
| Начальная цена продажи | 384 000 000 (триста восемьдесят четыре миллиона) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 19 200 000 (девятнадцать миллионов двести тысяч) белорусских рублей |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», 231761, г. Скидель, ул. Промышленная, 1, 8-0152-97-70-90, факс 97-78-68 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 11 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.11.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 04 марта 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **ЛОТ №1.** Автомобиль GREAT WALL HOVER, гос. №5199BI-2, 2008 г.в., красного цвета, начальная стоимость лота 70.550.000 белорусских рублей. **ЛОТ №2.** Автомобиль GREAT WALL HOVER, гос. №7235 EI-2, 2011 г.в., черного цвета, начальная стоимость лота 167.625.000 белорусских рублей. **ЛОТ №3.** Автомобиль VOLKSVAGEN TRANSPORTER, гос. №7708 ВЕ-2, 2000 г.в., серо-голубого цвета, начальная стоимость лота 92.038.000 белорусских рублей. **ЛОТ №4.** Автомобиль ВАЗ 21214120-40, гос. №5752 ЕЕ-2, 2012 г.в., темно-бордового цвета, начальная стоимость лота 43.910.000 белорусских рублей |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое акционерное общество «Коханово-Агро» |
| Местонахождение имущества | Толочинский р-н, г.п. Коханово, ул. Оршанская, 67. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Марченко Сергею Васильевичу, тел. 8 (029) 598-84-54 |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 03 марта 2016 года в 14.30 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 10.00 02 марта 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ЛИКВИДАТОР ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩЕГО ИМУЩЕСТВА ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (УНП 600025392):

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ-3110 | 3 103 920 |
| 2 | Автомобиль ВАЗ-21074 | 2 203 200 |
| 3 | Автомобиль ГАЗ-33023 | 4 335 120 |
| 4 | Автомобиль ГАЗ-4301 | 9 103 320 |
| 5 | Полуприцеп ОДАЗ-9958 | 8 871 120 |
| 6 | Каплеструйный принтер (Маркиратор) Willet 430 | 3 492 720 |
| 7 | Ящики вино-водочные пластмассовые | 5 702 (за штуку) |

Торги проводятся повторно второй раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 21.01.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 46%.

**Торги в виде аукциона состоятся 29 февраля 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10 (по месту нахождения организатора торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения.**

**Шаг аукциона – 5 процентов. Продавец – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88).**

**Организатор торгов – ООО «Партнер-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 315-58-26).**

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. *Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с №3012610007128 в филиале №612 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 810, УНП 600025392, получатель ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 10 дней с даты подписания договора купли-продажи.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **ЛОТ №1. Земельный участок с кадастровым номером 221285900018000028, площадь 0,1375 га, начальная стоимость лота – 23.612.000 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | Сысоев Сергей Олегович |
| Местонахождение имущества | Витебский р-н, Мазоловский с/с, садоводческое товарищество «Косолапинка». По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Белову Александру Александровичу, тел. 8 (029) 715-35-44 |
| Наличие бременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 03 марта 2016 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 10.00 02 марта 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 240/D-35132, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, д. 39А, площадь – 1688,3 кв.м, назначение – Помещение неустановленного назначения, наименование – помещение корпуса вспомогательных служб. Начальная стоимость лота – 1.507.000.000 белорусских рублей. (Обременений нет.) **Лот №2.** Оборудование – станок координатно-расточной, 1981 года выпуска, модель 2431, инвентарный номер 1753. Начальная стоимость лота – 99.700.000 белорусских рублей. (Обременений нет.) **Лот №3.** Оборудование – станок координатно-расточной, 1977 года выпуска, модель 2431, инвентарный номер 757. Начальная стоимость лота – 91.400.000 белорусских рублей. (Обременений нет.) **Лот №4.** Оборудование – установка вакуумная ВУ-1А, 1987 года выпуска, инвентарный номер 014. Начальная стоимость лота – 82.800.000 белорусских рублей. (Обременений нет.) **Лот №5.** Оборудование – установка вакуумная ВУ-1А, 1987 года выпуска, инвентарный номер 073. Начальная стоимость лота – 82.800.000 белорусских рублей. (Обременений нет) |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Оршанский инструментальный завод», УНП 300207906, юридический адрес: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 39А |
| Местонахождение имущества | г. Орша, ул. Мира, 39А Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Бегляк Александр Сергеевич: т.р. 8 0216 21 64 43, т.м. +37529 365 46 42; Степанова Татьяна Владимировна: 80216 21 68 81, т.м. +37529 219 22 47 |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1 4 марта 2016 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 3 марта 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Сам сабе рэжысёр

# «STUДЗЕНЬ»: ЧЫМ ЖЫВЕ СТУДЭНТ КОЖНЫ ДЗЕНЬ

## Сакрэты прыгатавання гумарыстычнай «стравы»




**Вучыцца і падпрацоўваць адначасова — ужо даўно не нова. А вось вучыцца і працаваць над маладзёжным серыялам — спалучэнне рэдкае. Улетку мінулага года студэнцкі медыяцэнтр Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы распачаў унікальны відэапраект. Гэта скетчкам*, які здымаюць самі студэнты. Праз ролікі яны хочуць паказаць цікавыя сітуацыі са свайго паўсядзённага жыцця, адсюль і назва — «STUДЗЕНЬ». Пляцоўкамі для здымак сталі не толькі родны ўнівер, інтэрнат, спартзала, сталовая, але і вуліцы горада, кавярні і клубы. У праекце ўжо паспелі прыняць удзел студэнты, аспіранты, магістранты і выкладчыкі з розных факультэтаў.**

**У чым адметнасць скетчкама і дзе яго можна ўбачыць, а таксама пра творчую каманду, якая выпускае «STUДЗЕНЬ», расказала рэдактар праекта і дацэнт кафедры журналістыкі Іна МІНЧУК.**

— У нашым універсітэце ўжо даўно здымаюць выпускі навін, сацыяльныя і дакументальныя ролікі. Але, каб была акцёрская ігра, такое ўпершыню. Рашэнне аб запуску «STUДНЯ» было прынята на ўзроўні рэктара Андрэя Дзмітрыевіча Караля. Ён вельмі падтрымлівае нас у матэрыяльным плане: тэхнікай, захвочваннем студэнтаў.

З верасня наш скетчкам пачаў выходзіць на канале «Беларусь 2» у праграме «Раніца добрага дня» — па пятніцах можна ўбачыць адзін з эпізодаў. Дарэчы, яшчэ мала хто ведае, але мы ставім сабе за мэту пашырыць свае межы і ў хуткім часе плануем выходзіць цэлым выпускам на «Беларусь 4».

***— Іна Іванаўна, і ўсе ж такі ў чым арыгінальнасць праекта?***

— На беларускім тэлебачанні ёсць праграмы ў жанры скетчкама, але наш адрозніваецца тым, што ён прысвечаны толькі студэнцтву. І ўсе эпізоды прывязаны да цэлага дня: раніца, дзень, вечар, ноч. У адной серыі пяць эпізодаў. Часцей яны звязаны са студэнцкай практыкай, анекдотамі. Бывае, што мы выкарыстоўваем рэальныя цікавыя гісторыі з жыцця нашых «акцёраў». Гэта і натхняе на новыя ідэі.

***— Хто ўваходзіць у склад творчай каманды?***

— Уся наша здымачная група — гэта студэнты — супрацоўнікі студэнцкага медыяцэнтра ўніверсітэта. Дарына Рапейка і Насця Салейка — рэжысёры, Даша Гаўрыльчук — сцэнарыст, Жэня Сідар і Андрэй Саўко — аператары-мантажоры. Кіруе праектам загадчык кафедры журналістыкі Тамара Анатольеўна Піваварчык. Я з'яўляюся рэдактарам. Мая задача — накіраваць і падказаць, арганізаваць працу студэнтаў.

***— Ці ёсць спецыяльныя крытэрыі адбору акцёраў?***

— У гэтым яшчэ адна асаблівасць нашага праекта: здымацца могуць усе без выключэння. У «STUДНІ» паўдзельнічалі ўжо больш за 50 студэнтаў з розных факультэтаў. У эпізодах зняліся яшчэ і выкладчыкі ўніверсітэта! Дарэчы, некаторым студэнтам было не складана трымацца перад камерай, бо да гэтага яны ігралі ў тэатральна-паэтычнай студыі «Аўра», якой кіравала выкладчык Ганна Віктараўна Жэгала.

***— Ужо паспелі прыняць удзел у якіх-небудзь конкурсах?***

— У міжвузаўскім конкурсе студэнцкіх відэафільмаў «Відэарадыус БНТУ 2015» мы ўзялі трэцяе месца і заваявалі перамогу ў некалькіх намінацыях.

**Пра стварэнне «STUДНЯ» расказалі і ўдзельнікі здымачнай каманды.**

**Насця САЛЕЙКА, рэжысёр, актрыса, студэнтка IV курса спецыяльнасці «Журналістыка»:**

— Спачатку неабходная ідэя, потым — сцэнарый. І тут трэба ўсё прадумаць: тэкст, месца для здымак, падбор акцёраў, фон... Пасля напісання раскадроўкі — здымаем. Гэта самы пазітыўны працэс. Я сачу за агульным настроем, інтанацыяй, мімікай, жэстамі. У сцэнарыі прапісаць усё не атрымліваецца, таму дадумваем падчас здымак.

**Жэня СІДАР, аператар-мантажор, студэнт III курса спецыяльнасці «Журналістыка»:**

— Здымаць і манціраваць відэа не складана, а нават весела. Адзінае, бывае, цяжка сумяшчаць гэта з вучобай. Час мантажу залежыць ад працягласці эпізоду, колькасці дыялогаў, дынамікі сцэнкі. У сярэднім гэта пяць-шэсць гадзін. Калі-нікалі спраўляюся і за дзве-тры, але бывае, што патрэбна і сем-дзевяць гадзін. А так працэс вельмі жывы, цікавы, шмат смешных ляпаў бывае. На здымачнай пляцоўцы час ляціць хутка. Дарэчы, мы ні разу не пераздымалі сцэнкі. Адразу ўсё рабілі якасна.

**Дарына РАПЕЙКА, рэжысёр, актрыса, студэнтка III курса спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя»:**

— Мне вельмі падабаецца працаваць у гэтым праекце, ён дае магчымасць развіць свой творчы патэнцыял, праявіць сябе, увасобіць ідэі ў жыццё. Асабіста мне больш даспадобы кіраваць працэсам, чым здымацца самой. Даходліва растлумачыць акцёру яго задачу і вызначыць настрой, у якім яму трэба паказаць героя на камеру, — бадай, гэта асноўны мой абавязак як рэжысёра ў праекце.

**Таццяна ЛАЎШ,**
**студэнтка III курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы.**

* Скетчкам («камедыйная замалёўка») — камедыйны серыял, дзе адны і тыя ж акцёры выступаюць у ролях розных герояў. Яны разыгрываюць эпізоды, якія не звязаны паміж сабой, але могуць быць аб'яднаны агульнай тэмай.

Не вучобай адзінай

# РАЗАМ ПА ЖЫЦЦІ — З УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ЛАЎКІ

**Маладая студэнцкая сям'я ўспамінае гісторыю свайго знаёмства, тлумачыць, як шлюб можа дапамагчы ў вучобе, і дзеліцца планамі на «жыццё пасля размеркавання».**



## Паўгода проста сябравалі

Аня і Юра Ямеліны ажаніліся мінулым летам. Маладая сям'я з задавальненнем паказвае фотаздымкі з вяселля, каментуючы амаль кожную дэталь.

— Макіяж тут быў для мяне нязвыклы, — гаворыць Ганна, — я так раней ніколі не фарбавалася. Але Юра сказаў, што я была вельмі прыгожай.

— Я і зараз магу гэта пацвердзіць, — ажыўляецца хлопец.

Юра прызнаецца, што не заўсёды ва ўсім пагаджаецца з жонкай, але, на шчасце, гэтыя разыходжанні тычацца толькі дробязяў. Напрыклад, хлопцу не вельмі падабаюцца мяккія цацкі Ганны, якімі застаўлены ўвесь пакой маладых. Але ў той жа час ён сам дорыць іх жонцы! Мабыць, як тут адмовіць, калі яна ад гэтых мядзведзікаў такое задавальненне атрымлівае!

— А я аднойчы камп'ютарную гульню выдаліла, у якой Юра днямі «сядзеў», — далучаецца Ганна. — Крыку спачатку было!.. Але ў выніку ўсе засталіся задаволеныя. Часу вольнага шмат з'явілася!

Менавіта з сумеснага баўлення часу пасля заняткаў і пачалося сяброўства Ганны і Юры. Хлопец і дзяўчына навучаюцца на энергетычным факультэце БНТУ. На патоку каля ста студэнтаў і, як кажуць маладыя, яны нават у твар адзін аднаго доўгі час не ведалі. Усё змяніла засяленне ў інтэрнат. Студэнты-першакурснікі, самі не разумеючы, як гэта атрымалася, пачалі разам гатаваць вячэру, рыхтавацца да заняткаў, глядзець фільмы.

— Паўгода мы проста сябравалі! — расказвае Ганна. — Ніхто ў гэта, зразумела, не верыў. Нават матуля мая заўсёды неяк іранічна ўсміхалася, чуючы пра Юру. Але спачатку было сапраўды сяброўства!

Пра тое, што дзяўчына робіць на «мужчынскім» факультэце, Ганна адразу адказала, што жаніха не шукала! Увогуле, замуж раней пятага курса не збіралася! Проста вырашыла прадоўжыць сямейную дынастыю энергетыкаў.

— Вучыцца на нашым факультэце дзяўчатам не проста, але зараз мне ва ўсім дапамагае муж, — горда дадае Ганна.

І сапраўды, дапамагаць ёсць каму: Юра ідзе на «чырвоны» дыплом. Хлопец не толькі выдатна вучыцца, займаецца навуковай дзейнасцю, але і з'яўляецца майстрам спорту па традыцыйных відах барацьбы.

— Падтрымка іграе важную ролю ў тым, каб у чалавека ўсё атрымлівалася. Звычайна ёсць непахісная вера ў твае сілы бацькоў, але словы любай дзяўчыны, жонкі — гэта нешта іншае. Тое, што мае невытлумачальную энергетыку, — дзеліцца малады сужэнец.

## «Збіраюся ажаніцца з вашай дачкой!»

Пра тое, як у рэшце рэшт сяброўства ператварылася ў каханне, пара памятае добра. Гісторыя агульная, а вось адценні розныя. Ганна прызнаецца, што ўжо чакала, калі Юра прапануе ёй сустракацца. Але, як належыць дзяўчыне, першай крок зрабіць не магла. А Юру, каб зразумець, як яму не хапае Ганны ўжо не ў якасці сябра, спатрэбілася расстанне. Студэнты раз'ехаліся на канікулы па дамах: яна — у Верхнядзвінск, ён — у Слонім. А пасля вяртання ў Мінск утварылася новая пара.

— З таго часу 16-га чысла кожнага месяца — не проста лічба. Гэта наша маленькае свята, — дадае Ганна.

— Усе пытаюцца, навошта ісці адразу ў ЗАГС? Кажуць, трэба прыглядзецца, зразумець, што за чалавек побач з табою. І мне ёсць што ім адказаць: я шэсць месяцаў вывучаў сваю будучую жонку! — расказвае Юра.

Хлопец хваліцца, што Ганна вельмі смачна гатуе. Калі дзяўчына на кухні — увесь паверх інтэрната ад паху аблізваецца.

— Прапанову Юра зрабіў мне ў рэстаране. Завязаў вочы, пасадзіў за столік і прызнаўся ў каханні. Пярсцёнак, кветкі, музыка, — дзяўчына бліцца зноў пражывае тыя хвіліны.

Маладыя таксама расказалі, што стол, за якім усё адбылося, афіцыянты негалосна назвалі «шчаслівым». Літаральна за хвіліну да адыходу нашых маладых у рэстаран завітала таксама пара. Хлопец і дзяўчына хацелі сесці за стол побач, але персанал прапанаваў лепей сесці на месцы Ганны і Юры: тут толькі што прапанову зрабілі.

Да вяселля пара рыхтавалася амаль год. Свята ўдалося. Маладыя кажуць, што бацькі вестку аб тым, што дзеці вырашылі ўзяць шлюб, успрынялі спакойна. Толькі маці Ганны крыху хвалявалася, каб дачка вучобу не закінула! Але куды там, з такім сужэнцам! Дарэчы, нядаўна ён вярнуўся з міжнароднай алімпіяды па электраэнергетыцы, дзе каманда нашай краіны, удзельнікам якой быў Юра, заняла другое месца.

Юра кажа, што ніколі не забудзе адзін вельмі важны для яго тэлефонны званок. Быў час, калі ўсіх студэнтаў маглі выселіць з інтэрната па нейкіх там прычынах, і ён патэлефанаваў маці будучай жонкі. «Можна, у выпадку чаго, мы будзем жыць разам з Ганнай? Здымем кватэру?» — запытаў хлопец у будучай цешчы. На тым канцы проваду адказалі не адразу: «Гэта вельмі сур'ёзны крок, ты разумееш?!» «Вядома, я збіраюся ажаніцца з вашай дачкой!». У будучай цешчы, як зараз прызнаецца хлопец, не было слоў.

## Удваіх — значна весялей

Ганна і Юра зараз жывуць у інтэрнаце. Пакой маладыя атрымалі адразу пасля таго, як афіцыйна ўзялі шлюб. Студэнты вельмі ўдзячныя прафкаму студэнтаў, выкладчыкам і загадчыку інтэрната за тое, што далі першы сумесны дах над галавой.

— Нам тут падабаецца! Усё для жыцця ёсць, а ў прыдачу весялосць і сябры побач! Што яшчэ трэба? — лічыць Юра.

— І побыт нас не «з'еў», як усе кажуць! Наадварот! Столькі агульных інтарэсаў, планаў з'явілася. Толькі паспяваў усё ўвасабляць, — гаворыць Ганна.

Маладыя прызнаюцца, што выкладчыкі адрэагавалі на іх шлюб станоўча: галоўнае, каб лекцыі не прагульвалі.

— Увогуле, з жонкай бавіць час куды цікавей, чым аднаму! Калі ты адзінокі, прыходзіцца шукаць сабе кампанію, а тут твой аднадумца заўсёды побач! Хіба гэта не шчасце? — разважае Юра.

Сямейны бюджэт маладыя вядуць разам. Часам Юра трохі апускае жонку на зямлю, але гаспадыня і сама добра разумее, колькі сродкаў і на якія мэты засталося там, у скарбонцы. Ганна і Юра заўсёды летам стараюцца падпрацоўваць. Калі па спецыяльнасці, калі — не. Заробак невялікі, але здабыты ўласнаручна. Мужа і жонку таксама падтрымлівае прафкам студэнтаў БНТУ і ўніверсітэт.

Пра дзяцей маладыя пакуль не думаюць. Спачатку трэба скончыць вучобу, уладкавацца на працу. Зараз, на пятым курсе, больш за ўсё студэнцкую сям'ю хвалюе размеркаванне. Выпускнікі хацелі б застацца ў Мінску, але як там будзе, пакажа час.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

SEX=БАЛЯСЫ

# НЕ Ў ЛАБУТЭНАХ ШЧАСЦЕ

**Кліп групы «Ленінград» на песню «Экспанат» за кароткі прамежак часу стаў хітом праглядаў у сецiве: яго паспелі «зацаніць» каля 30 мільёнаў карыстальнікаў (а, можа, ужо і больш). Ён без перабольшвання стаў сапраўды народным, даўшы неабсяжную прастору для абмеркаванняў, жартаў, «падколак». Вы ж яго таксама бачылі? І, мабыць, не адзін раз? І да вас прычапілася гэтае «На лабутэнах і ў... штанах...» (назавём іх «вельмі моднымі»)? У чым той самы ашаламляльны поспех кліпа? Думаю, што нават не столькі ў самой скандальнай манеры выканання песень «Ленінградам» (хоць ёсць прыхільнікі і такога жанру), а найперш у пазнавальнасці сітуацыі, паказанай у кліпе. Знятае гэткім своеасаблівым бальзамам лягло на душы гледачоў, таму што кожны ў ім пазнаў-прыгадаў сябе. І не мае вялікага значэння, хлопчык ты ці дзяўчынка. Усе мы аднолькава збіраліся на спатканні, імкнучыся ўразіць адно аднаго.**

Словам, група закранула (а актрыса ў кліпе па-майстэрску разыграла) спрадвечны сюжэт. Памятаеце закадравы тэкст з фільма «Сцеражыся аўтамабіля»? «Гэтыя чароўныя моманты пагоні...» І далейшы дыялог паміж героямі Жжонава і Смактуноўскага: «А ты чаму ўцякаў? — Звычка. Ты даганяеш — я ўцякаю. А ты чаму даганяў? — Дык і ў мяне звычка». Так заўсёды бывае паміж хлопцам і дзяўчынай. Такая даўняя гульня паміж паламі са сваімі «тайнымі» для кожнага з ігракоў правіламі. Гераіня кліпа збіраецца на выставу, хоць насамрэч мэтай гэтага культпаходу з'яўляецца зусім не знаёмства з шэдэўрамі галандскага жывапісца: «Вадзіў мяне Сярога на выстаўку Ван Гога...» («Пойдзеш са мной у музей? — Ты неяк дзіўна вымаўляеш слова «рэстаран»!) Галоўная задача дзяўчыны — гэта ўразіць хлопца, стаць для яго галоўным «экспанатам» на выставе. Вядома, калі абраннік, гаворачы словамі галоўнай гераіні «Сексу ў вялікім горадзе», мужчына яе мары. «Алілуя!» — гучыць у гэты момант у кліпе, гераіня ўжо ўяўляе ўласнае вяселле... Некаторыя рамантычныя асобы ў такой сітуацыі нешта там пра матылькоў у жываце кажуць... Калі гэта так, усе сродкі падыходзяць! Можна нават крыху схлусіць. Ну, так, зусім-зусім крышачку наплесці пра занятак жывапісам у «пасцельных» тонах...



Дамовіліся пра спатканне? Выдатна! Але гэта толькі палова справы, не мне вам гаварыць. Трэба ж і выглядаць адпаведна, як на вокладцы глянцавага часопіса! Божухна, а «пятая ж кропка» ні ў якія штаны (тыя самыя, «вельмі модныя») не ўмяшчаецца! («Большасць жанчын пачынае худзець за дзве гадзіны да ад'езду на курорт».) А ўлезці трэба! («І нічога з жанчынамі не складана. Абняў, сказаў, што прыгожая, разумная. Калі нічога ў галаву не прыходзіць, спытаў: «Я не зразумеў, ты пахудзела, ці што?» Гатова. Вы — ідэальны мужчына».) І ніякія ахвяры і разбурэнні нас не спыняць! Дзеля прыгажосці слабы пол (хаця які ж ён слабы?) яшчэ і не на тое здольны. («Гавораць, што калі жанчына адначасова здымае туфлі на высокіх абцасах і бюстгальтар, то можа памерці ад задавальнення».) Пра нафарбавацца і павялічыць вусны спецыяльным прыборам і гаварыць не буду — гэта ж як мае быць. («Паненка, я бачу, вы любіце маляваць! — А як вы здагадаліся? — Па бровах».)

Ну і, вядома ж, у вобразе павінна быць асаблівая «фішка»! (Памятаеце дыялог з фільма «12 крэслаў»: «Вельмі прыгожае футра! — Жартуеце! Гэта мексіканскі тушкан».) А ў кожнай дзяўчыны, як вядома, дзве галоўныя бяды: няма месца ў шафе і няма чаго апрануць. Але можна патрэбнае пазычыць! Зноў жа абсалютная праўда жыцця, стапрацэнтнае супадзенне кліпа з рэчаіснасцю. Вам любая прадстаўніца прыгожага полу пацвердзіць, што хоць аднойчы брала напракат у сястры або сяброўкі якую-небудзь рэч ці аксесуар. Што гаварыць, сам калісьці ў старэйшага стрыечнага брата прасіў панасіць фірменную «лакостаўскую» тэніску.

**Можна нават крыху схлусіць. Ну, так, зусім-зусім крышачку наплесці пра занятак жывапісам у «пасцельных» тонах...**

Гераіня кліпа вырашае, што разынкай яе вобраза будуць лабутэны — туфлі на высокіх абцасах. Гавораць, фірменныя каштуюць ад адной да сямі тысяч долараў! (Фільм «Самая абаяльная і прывабная», эпізод з «фарцоўшчыкам»: «У джынсы ўжо апранаюцца нават самыя адсталыя слаі насельніцтва».) Адрозненнем лабутэнаў з'яўляецца чырвоная падэшва, якую іншыя вытворцы выкарыстоўваць не могуць, бо яна абароненая аўтарскімі правамі. Таму многія прыгажуні робяць проста: у не фірменных туфлях замалёўваюць падэшву чырвонай фарбай або лакам, што ўласна і робіць гераіня кліпа. (Чулі анекдот, які нарадзіўся пасля яго выхаду? «Лабутэны — гэта вывернутыя галёшы. Не будзь дурніцай, насі айчыннае!») А гэта ўжо не жарт, а з падслуханага ў жыцці. Добрая знаёмая падзялілася. Выпадкова пачула размову дзвюх жанчын, якія абмяркоўвалі і кліп, і абутак: «А лабутэны, між іншым, на «Імпульсе» (гандлёвы цэнтр у сталіцы. — **Аўт.**) прадаюцца. Там яшчэ Крысціян Дзіор ёсць і Іў Сэн-Ларан. — А вось гэты прыбор для вуснаў каштуе амаль 150 долараў, жах проста! — Але вусны і без яго можна «зрабіць» — слоічкам...» Знаёмая прызналася, што цяпер гэты «слоічак» не дае ёй спакою. Ну, і лабутэны на «Імпульсе» таксама. (Заслона, авацыі...)

А ведаеце, чаму яшчэ, на мой погляд, кліп стаў народным хітом? У канцы ў гераіні на пікантным месцы рвуцца штаны і яна падае на падлогу. Макіяж сапсаваны, нос разбіты... І ў гэты самы момант раздаецца званок у дзверы: па дзяўчыну заехаў яе прынц. Перамагаючы боль, яна паўзе да ўваходу, з цяжкасцю падымаецца і адчыняе... Прыклаўшы столькі намаганняў, ты не маеш права здавацца! Нават без лабутэнаў...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Галоўнае — не страціць самабытнасць»



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Ці лёгка было працаваць з прафесіяналам такога ўзроўню?***

**М.:** Мы не сумняваліся, што ўсё ў надзейных руках. А пачуццё адказнасці было ў абодвух бакоў.

**В.:** — Нам хацелася, каб англійская мова гучала на ўзроўні, без дэфектаў. Спецыяльна запрасілі на запіс нашага знаёмага, ён услухоўваўся ў кожны гук. Хоць у Амерыцы, куды людзі прыязджаюць з розных краін, не вельмі хвалююцца наконт акцэнту. Таму падчас запісу ўсе здзіўляліся, чаму мы так з-за гэтага перажываем.

**«Захаванне самабытнасці, традыцый сёння залежыць выключна ад сям'і. Мы вось арганізуем беларускія вечарынкі, таму што не можам без гэтага. Хоць ужо і жывём па амерыканскім стандартах, але хочацца заставацца сабой».**

**М.:** — Можа і не варта перажываць, бо існуе шмат гуртоў, якія спяваюць з акцэнтам і пры гэтым з'яўляюцца вельмі папулярнымі. Але ж, маючы справу з Шэкспірам, нам хацелася наблізіцца да добрага вымаўлення.

***— Яшчэ да ад'езду вы казалі, што «Нью-Ёрк — Мекка для музыкантаў». Змаглі за два гады адчуць гэта?***

**В.:** — Там музыка гучыць на кожным кроку. Самая розная: ад аўтэнтычнай кубінскай ці афраамерыканскай да розных сучасных электронных кірункаў. Людзі прыязджаюць з усяго свету, і кожны прывозіць нешта сваё.

**М.:** — Нават у метро ёсць верагоднасць спаткаць такіх таленавітых музыкантаў, якія проста «за раз» набіраюць шматмільённыя прагляды ў інтэрнэце.

**В.:** — Яшчэ Фрэнк Сінатра неяк сказаў: «Калі ты зробіш гэта тут, то зробіш і ўсюды». Праўда, што публіка там пераборлівая, але пасля яе ў любым месцы ўжо будзе лягчэй.

***— Пры якіх абставінах вы вырашылі паехаць туды? І як прыняў вас мегаполіс?***

**В.:** — Мы не думалі, што затрымаемся там надоўга. Планавалі толькі з'ездзіць на некалькі месяцаў, зняць пару кліпаў, павыступаць і вярнуцца. Але нас зацягнула... У нас ёсць ідэі, мэты, і, думаю, пакуль іх не здзейснім, горад нас не адпусціць дадому. Я ўжо не кажу пра тое, што мы проста палюбілі гэтае месца.

***— І якое яно, замежжа, калі становіцца буднямі?***

**В.:** — Узгадайце «Масква слязам не верыць» — у Нью-Ёрку дзейнічаюць тыя ж правілы. Патрэбны стальныя нервы, воля, характар і вынослівасць. Такія гарады заўсёды выпрабоўваюць нас, там вялікая плынь людзей. Ва ўсіх па-рознаму складваецца. Мы паехалі туды, і прайшло ўжо два гады, а мы нават гэтага не заўважылі.

***— А калі гаварыць пра чалавечыя ўзаемаадносіны...***

**М.:** — Трэба заўсёды быць пільным.

**В.:** — Гэта якраз адзін з бар'ераў, які прымушае людзей адмаўляцца ад сваіх ідэй і вяртацца назад. Таму што фармат узаемаадносін там зусім іншы. Амерыканцы заўсёды ветлівыя і ўсміхаюцца вам, робяць кампліменты, але гэта толькі вонкавая карцінка. Калі ж вам захочацца душэўнасці, пагаварыць «за жыццё», то ніхто вас не будзе слухаць. Таму ў Беларусь мы прыязджаем у тым ліку і па эмацыянальнае сілкаванне. Сустрэчы з сябрамі, бацькамі — вось што нас падтрымлівае наступныя паўгода.



**«Запрасілі на запіс нашага знаёмага, ён услухоўваўся ў кожны гук. Хоць у Амерыцы, куды людзі прыязджаюць з розных краін, не вельмі хвалююцца наконт акцэнту. Таму падчас запісу ўсе здзіўляліся, чаму мы так з-за гэтага перажываем».**

***— Як вы думаеце, ці ёсць рызыка страціць індывідуальнасць ва ўмовах глабалізацыі?***

**М.:** — Самабытнасць выхоўваюць у дзіцяці бацькі.

**В.:** — Можна прывесці шмат прыкладаў, калі сем'і прыязджаюць у Злучаныя Штаты з Украіны, Францыі ці іншых краін, але не адмаўляюцца ад сваёй роднай мовы. Дома яны жывуць згодна з традыцыямі сваёй радзімы. Прычым гэта датычыцца не толькі мовы, але і ежы, адзення, іншых момантаў... Амерыка складаецца з эмігрантаў, і за трыста гадоў ужо выпрацавалася методыка, як чалавеку заставацца самім сабой. Захаванне самабытнасці, традыцый сёння залежыць выключна ад сям'і. Мы вось арганізуем беларускія вечарынкі, таму што не можам без гэтага. Хоць ужо і жывём па амерыканскім стандартах, але хочацца заставацца сабой.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

**(Яшчэ падрабязней — на сайце: zviazda.by)**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.108.
Нумар падпісаны ў 19.30 17.02.2016 г.

■ Белліт у свеце

# ТАЛЕНТЫ — НА СЛУЖБЕ Ў НАРОДАЎ

**Сярод удзельнікаў II Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час», які завяршыў сваю работу ў Мінску на мінулым тыдні, была і госця з Казахстана — загадчык аддзела аналітыкі і знешніх літаратурных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтва імя М.А. Аўэзава Святлана АНАНЬЕВА. З ёй і гутарыць наш карэспандэнт:**



***— «Дружба народаў — дружба літаратур» — хіба гэта сёння модна, Святлана Віктараўна? І ўвогуле, ці патрэбны такія форумы, які сабраў у Мінску пісьменнікаў з 15 краін?***

— На памяці — выступленне галоўнага рэдактара часопіса «Дружба народов» вядомага рускага празаіка Аляксандра Эбанаідзе ў леташнім маі на форуме літаратур краін Прыкаспія «Каспій — мора дружбы». Ён сказаў, што было шмат ахвотнікаў змяніць назву часопіса «Дружба народов», ды рэдакцыя, ён сам настойліва абаранілі гэтае імя. Вось і мы ў сваім Інстытуце літаратуры і мастацтва імя М.А. Аўэзава за апошнія гады шмат зрабілі для ўзнаўлення літаратурных сувязяў. І неяк так склалася, што ў значнай ступені цяпер выступаем прапагандыстамі беларускай літаратуры ў Казахстане, ды і следам у свеце. Бо ў нас вялікія сувязі, шырокі камунікат. Пішам манаграфіі кшталту «Літаратурна-мастацкі дыялог», «Найноўшая замежная літаратура», выдаём навуковыя зборнікі — і паўсюль у нас «беларускія старонкі». А вядучыя літаратурна-мастацкія часопісы Казахстана не могуць абысціся без таго, каб не пазнаёміць сваіх чытачоў з новымі творамі сучасных беларускіх пісьменнікаў. Як тут не згадаць словы Абая Кунанбаева: «Талент, пастаўлены на службу дружбе народаў, — талент памножаны».

І калі я прыязджаю ў Мінск, калі ўдзельнічаю ў арганізаваных беларусамі дыскусіях, то бачу, што славутая беларуская талерантнасць, жаданне ствараць атмасферу добрасуседства з усім светам, — усё гэта працуе на выхаванне грамадства мастацкімі сродкамі, на выхаванне за кошт літаратуры. Ваш прыклад — уражлівы. Менавіта такія сустрэчы робяць межы паміж краінамі не бастыёнамі, а хутчэй — лініямі, якія выразна бароняць мір і гуманістычнае разуменне свету.

***— Выходзіць, што кансалідацыя літаратурных сіл паміж народамі і краінамі ўсё ж патрэбная?..***

— Літаратура, напэўна, самы лепшы сродак для таго, каб народы свету ведалі адзін аднаго і адзін пра аднаго. У развіцці літаратур розных краін свету выразна прасочваюцца агульныя тэндэнцыі, магістральныя накірункі. Цікава выявіць тыя матывы, раскрыць агульныя тэмы ў кожнай з нацыянальных літаратур. Зусім унікальнымі ў плане збліжэння літаратур, у плане кансалідацыі падаюцца сучасны мастацкі пераклад і дыялог на розным узроўні. Калі нават не весці размову пра кансалідацыю літаратурных сіл, то ўжо пра дыялог паміж імі мы можам гаварыць смела і ўпэўнена. Радуе, што беларусы заўжды сустракаюць удзельнікаў сімпозіума ў лютым, «круглых сталоў» у межах Дня беларускага пісьменства ў верасні выдатнымі падарункамі. Да гэтых дзён выходзяць кнігі новых перакладаў, традыцыяй стаў выпуск альманаха «Сугучча». Вы дапамагаеце нам зазірнуць у літаратуры іншых народаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

***— Але ці можа замежная літаратура быць важным складнікам у фарміраванні суверэнных, незалежных каштоўнасцяў, аб чым заклапочаны сёння будаўнікі новых дзяржаў?***

— Замежная літаратура — наўрад ці. Свае літаратуры, шматаблічча і ўнікальнасць іх уплываюць на фарміраванне галоўных жыццёвых каштоўнасцяў, на выхаванне маладога пакалення, якое, безумоўна, чытае сусветныя бестселеры, папулярныя кнігі прозы, радзей — паэзіі. Замежная кінапрадукцыя аказвае, можа быць, болей моцны непасрэдны ўплыў на фарміраванне каштоўнасных арыенціраў. Але ў гэтым плане замежным узорам культурнай экспансіі павінны супрацьстаяць айчынныя майстры мастацкага слова. Перад імі стаіць задача стварэння канкурэтаздольных раманаў, аповесцяў, п'ес...

Здаецца, Юрый Палякоў гаварыў пра тое, што патрэбны новы ўзровень кантактаў, каб зрабіць культурнае рэха мацнейшым, бо якраз дыялог культур супрацьстаіць іх уніфікацыі ў эпоху глабалізацыі.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО**

■ Нефармат



# ВІНАВАТА КАХАННЕ ЦІ ЯГО АДСУТНАСЦЬ?

**І смех, і грэх. Каб маладога, здаровага мужыка вадзілі за нос гадамі, як маленькае дзіця? Цалкам верагодна, скажуць вам праваахоўнікі і следчыя аднаго з палескіх райцэнтраў. Цяпер там расследуецца справа маладой жанчыны, якая за некалькі гадоў атрымала 172 мільёны рублёў ад даверлівых мужчын. У райцэнтры далёка не кожны мае столькі ў якасці зарплаты, скажам, за тры гады. А яна сабе названую «зарплату» забяспечыла махлярствам. Пры гэтым сядзела дома, у асноўным за камп'ютарам, а наіўныя мужчыны самі пераводзілі грошы ёй на рахунак. Калі каротка, вось гісторыя аднаго з іх.**

Мінчанін убачыў у адной з тэлеперадач бягучы радок: «Дзяўчына жадае пазнаёміцца з хлопцам» і адразу ж набраў указаны нумар тэлефона. Яму адказаў прыемны жаночы голас. Пасля ён атрымаў фота і, можна сказаць, закахаўся з першага погляду. Тэлефонныя стасункі дапаўняліся перапіскай у сецібе, пачуццё нарастала... А каханая расказвала гісторыю няўдалага замужжа, скардзілася, што муж п'е і крыўдзіць яе, клялася, што хутка атрымае развод і пераедзе ў сталіцу. Далей патэнцыяльная «нявеста» паведамляла, што яна ўжо прадала кватэру ў сваім горадзе, але для набыцця жылля ў Мінску грошай не хопіць, і паволна падводзіла да думкі, што жаніх павінен таксама ўнесці долю. Ён і ўносіў — рэгулярна, кожны месяц пералічваў сумы ледзь не пяць гадоў! Для гэтага прадаў машыну, браў крэдыты. Такім чынам перадаў аферыстцы, з якой ніколі нават не сустракаўся, больш за 46 мільёнаў рублёў. (Толькі потым ён даведаецца, што ў гэты ж час яна клялася ў каханні яшчэ і жыхару Віцебска, які таксама пералічыў на ўладкаванне будучага сямейнага гнязда 78 мільёнаў.)

А дама тым часам варыла мужу боршч, гадавала дзяцей (бо яна шматдзетная маці), пачціва абыходзілася з суседкамі. Ніхто і падумаць не мог пра яе дрэнна, з усіх бакоў станоўчая асоба. Ёсць жа ў палескай глыбінцы артысткі! Гэта ж трэба ўмець так пераўвасабляцца, што мужыкі пасля двух-трох тэлефонных размоў ды сумніўных карцінак з сецібе гублялі галовы і дасылалі грошы невядома куды і невядома каму!

У дадзеным кантэксце мне цікавая не махлярка, бо такіх цяпер у кожным горадзе хоць возам вязі, а яе ахвяры. Няўжо таго мінчаніна не насцярожвала ну хоць бы адзін з пунктаў яе легенды? Напрыклад, той факт, што яна пазбягае сустрэчы. Некалькі разоў прызначала спатканні ў Лідзе, быццам бы ў горадзе, дзе жывуць яе бацькі, і ніколі не з'яўлялася. Ён прыязджаў, чакаў. А ў яе кожны раз нараджалася версія, якая праўдзіва і дэталёва апраўдвала немагчымасць прыехаць на малую радзіму. І ён верыў. Пры адпаведнай падрыхтоўцы палеская чараўніца магла б стаць рэзідэнтам любой разведкі. І ўсё ж...

Не задумаўся хлопец і пра дзіўны продаж кватэры ў Століне, дзе каханая працягвала спакойна жыць. Не ўлічыў, што цяпер можна прысылаць фотаздымак хоць галівудскай зоркі. А вось «арыгінал», які вельмі адрозніваўся ад вобраза на фота, ён убачыў толькі ў раённай міліцыі.

Няўжо не чытаў пра розных шлюбных і іншых аферыстаў у інтэрнэце, нават калі больш нічога і нідзе не чытае? Відаць, чытаў. Але цяпер многія адгароджваюцца ад рэальнага жыцця стасункамі ў сеціве, праглядам чужых кахання і пакут у бясконцых серыялах, і потым аказваюцца безабароннымі перад рэальным жыццём. Відаць, лягчэй любіць вобраз, нават той, які нехта штучна ставарае, чым любіць жывога чалавека з грахамі і памылкамі, як пяецца ў песні. А кахання ўсё роўна хочацца ўсім, і ў пагоні за ім чалавек гатовы даваць сябе падманваць бясконца. Яшчэ з часоў Астапа Бэндэра лічылася, што ахвярамі падобных афер бываюць жанчыны, якія заўсёды і зноў падсвядома імкнуцца да шчасця. Не так даўно паказвалі па тэлебачанні аднаго гарачага і смуглявага мача з былой савецкай рэспублікі, што падмануў нямала беларускіх жанчын. А вось апошнім часам усё больш паведамленняў сустракаецца пра небарак-мужчын. Каханне патрэбна і тым, і другім. І на гэтым удала ўмеюць сыграць прайдзісветы абодвух палоў.

На сустрэчы з журналістамі ў Брэсце кіраўнік Следчага камітэта Беларусі Іван Наскевіч з вялікім шкадаваннем гаварыў, што справы аб махлярстве ідуць лавінай. Здаецца, чым больш інфармацыі пра гэтую навалу сыходзіць ледзь не з кожнага праса, тым больш становіцца наіўных і падманутых. Што гэта: прыкмета нашага менталітэту ці выдаткі замкнутасці чалавека ў сваім маленькім свеце? Мацнейшым за здаровы сэнс нярэдка робіцца жаданне паверыць у добрае і светлае на фоне татальнай адзіноты ў вялікім горадзе. Але... Каб знайсці сваё шчасце, часам бывае дастаткова ўважліва паглядзець вакол сябе. Можа, і жыхар Мінска, якога так вытанчана падманулі, цяпер гэтак жа думае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# На МАХімальна высокім узроўні

**У 2016 годзе прыярытэтным кірункам у дзейнасці Мінскага філіяла «Белпошты» стане забеспячэнне высокага ўзроўню абслугоўвання.**

Філіял заўсёды арыентаваны на максімальнае задавальненне патрэб кліентаў. Удасканальваюцца тэхналагічныя працэсы, распрацоўваюцца новыя паслугі і сэрвісы, усё гэта адбываецца з улікам пажаданняў спажыўцоў.

Сёлета будзе ўведзена новая паслуга — адпраўленне «MAX». Яна дазволіць дасылаць па пошце пасылку або адпраўленне ўнутранай паскоранай пошты з непадзельным укладаннем вагой звыш 30 кг.

Для юрыдычных асоб плануецца ўвядзенне сэрвісу «EMS Дзелавы кур'ер» — гэта аператыўная дастаўка ў межах аднаго горада.

У Маладзечне будзе адкрыта новае сучаснае аддзяленне паштовай сувязі. Дарэчы, у Мінскай вобласці штогод адкрываецца новае аддзяленне паштовай сувязі.

Апроч пералічанага плануецца пашыраць сетку плацежна-даведачных тэрміналаў, якія дазваляюць атрымліваць паслугі без удзелу супрацоўніка аддзялення.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# Пасябраваць з законам

**Прафілактычная міжведамасная акцыя «Сябруем з законам» стартавала 5 лютага ў Мінскай вобласці. Яе мэта — фарміраванне ў дзяцей і моладзі законапаслухмяных паводзін, духоўных і маральных каштоўнасцяў, імкненне да здаровага ладу жыцця.**

Як адзначыла **старшыня абласной камісіі па справах непаўналетніх Ала КАРДАШ**, у межах акцыі, якая завершыцца 25 лютага, запланаваны спартыўныя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы па прававым выхаванні, прэзентацыя разнастайных гурткоў, конкурс малюнкаў. Па вечарах міліцыянеры будуць правяраць грамадскія месцы, дзе збіраюцца падлеткі. Акрамя таго, супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх будуць праводзіць маніторынг работы ў вячэрні час спартыўных секцый, гурткоў і клубаў па інтарэсах. Ва ўстановах адукацыі, культуры, спорту і турызму ў гэтыя дні пройдуць пазакласныя гадзіны, лекцыі, вікторыны, «круглыя сталы» з дэманстрацыяй відэаролікаў, сюжэтаў па папярэджанні і прафілактыцы шкодных звычак. А ў судах, органах унутраных спраў, па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, аховы здароўя, рэлігійных арганізацыях адбудуцца дні адкрытых дзвярэй для навучэнцаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# ВЫВУЧАЕМ АЗБУКУ... АРНАМЕНТУ

## У Магілёве рэалізуецца ўнікальны праект «Азбука беларускага арнаменту» з удзелам творчых асоб



**На вуліцах горада ўжо з'явіліся тры першыя білборды, упрыгожаныя беларускімі сімваламі энергіі, росквіту і сонца. Побач з імі — гонар Магілёўшчыны — уладальніцы Гран-пры, пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх вакальных фестываляў і конкурсаў Валерыя Азаранка і Вольга Канавалава і салістка Магілёўскай абласной філармоніі Вольга Гарнічар, якая ўдастоілася гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры.**

— Ідэя падаць беларускі арнамент праз асоб «ад мастацтва» вельмі актуальная, бо менавіта яны спрыяюць захаванню нацыянальных духоўных традыцый і развіццю беларускай культуры, а таксама папулярызуюць яе за мяжой, — адзначыла **Іна КАРАТКЕВІЧ, начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама**. Менавіта гэта ўпраўленне выступіла ініцыятарам праекта.

Памочнікам у рэалізацыі карыснай справы стала рэкламнае агенцтва «Рекламатар» — буйны распрацоўшчык праектаў, у тым ліку і сацыяльных. (З найбольш вядомых — «Дажынкі», «Александрыя збірае сяброў», «Моладзь. Будучыня».)

— Тэматычныя плакаты на рэкламных шчытах — толькі першы крок у рэалізацыі праекта «Азбука беларускага арнаменту». Зараз мы працуем над далейшымі спосабамі падачы інфармацыі. Магчыма, гэта будзе тэматычны сайт, група ў сацыяльных сетках, флэшмобы, — удакладніла каардынатар праекта Юлія Антоненка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

Очередное общее собрание акционеров

## ОАО «МинскСортСемОвощ»

**(223017, Минский район, а/г. Гатово)**
**по решению наблюдательного совета Общества**
**состоится в очной форме 24 марта 2016 года**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год и основные направления его деятельности в 2016 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2015 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2015 год и направлений использования чистой прибыли в 2016 году. Выплата дивидендов за 2015 год.
6. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
7. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об оказании благотворительной (спонсорской) помощи семенами и другими ресурсами общественным организациям, инвалидам, детским приютам, больницам и другим некоммерческим организациям социальной направленности в 2015 году и утверждении ее суммы на 2016 год.

**Место проведения собрания**:
г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).
**Начало собрания**: 09 часов 00 мин.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 8 часов 30 мин. до 8 часов 55 мин. по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 9 до 16 часов в рабочие дни (понедельник-пятница), **начиная с 04 марта 2016 года, по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию **на 23 февраля 2016 года.**

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

***Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»***

УНН 600052664

## ООО «Экономическая стратегия» – ликвидатор ООО «ШТОФФ»

### извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 22 марта 2016 года в 12.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 4.**

*Для участия в торгах необходимо подать до 17 марта 2016 года заявку и перечислить на расчетный счет ООО «ШТОФФ» р/с 3012226520011 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, код 153001117, УНП 192204167 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.*

